

Дзень падпісчыка «Белпошта» прызначыла на 12-га 12.12... у 12.12. Наша падпісчыца Таццяна Мацкевіч з унукам размаўляць на роднай мове яшчэ толькі пачынае: маленькі ён, другі годзік толькі пайшоў. СТАР 3



Ідэальна, калі першае наведванне стаматолага адбудзецца адразу пасля прарэзвання першых зубоў — паміж 6 і 12 месяцамі. Наступныя наведванні неабходна рабіць не менш за адзін раз на паўгода. СТАР 5



Пры выбары пакаёвых раслін у першую чаргу арыентуйцеся на ўласныя адчуванні. Памятайце, што часцей за ўсё энергетычнымі вампірамі становяцца экзатычныя расліны. СТАР 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 СНЕЖНЯ 2012 г. ЧАЦВЕР № 240 (27355) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## БЕЛАРУСЬ — РАСІЯ: АДНОСІНЫ НАБІРАЮЦЬ АБАРОТЫ

**У Беларусі і Расіі сталі стабільныя гандлёва-эканамічныя адносіны, якія набіраюць абароты. Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч, сустракаючыся ўчора ў Маскве са сваім расійскім калегам Дзмітрыем Мядзведзевым, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што развіццю двухбаковага супрацоўніцтва ў значнай ступені спрыяюць сувязі на ўзроўні рэгіёнаў. Паводле яго слоў, у гэтым годзе ў Беларусі з візітамі пабывала 11 дэлегацый расійскіх рэгіёнаў.

Прэм'ер-міністр Беларусі адзначыў, што з утварэннем Мытнага саюза актывізавалася стварэнне беларуска-расійскіх сумесных прадпрыемстваў. Зараз у Беларусі працуюць 2 тыс.117 расійскіх або сумесных з расійскім капіталам прадпрыемстваў. Гэта складае 35% ад усіх зарэгістраваных у краіне суб'ектаў гаспадарання з замежным капіталам.

«Калі ёсць праблемы, пэўныя абмежавальнікі, яны могуць быць вырашаны ў час двухбаковых сустрэч, у тым ліку на пасяджэннях Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы», — сказаў Міхаіл Мясніковіч.

У сваю чаргу, прэм'ер-міністр Расіі Дзмітрый Мядзведзеў адзначыў, што беларуска-расійскі тавараабарот па выніках года дасягне $40 млрд. На думку кіраўніка расійскага ўрада, меркаваны рост па выніках года беларуска-расійскага тавараабароту ў значнай меры з'яўляецца вынікам стварэння Мытнага саюза.

Пасля двухбаковай сустрэчы прэм'ер-міністраў Беларусі і Расіі прайшло пасяджэнне Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы, у парадак дня якога было ўключана 36 пытанняў. Прэм'ер-міністры абмеркавалі даволі шырокі спектр беларуска-расійскіх адносін, сканцэнтраваўшыся, перш за ўсё, на эканамічных і гандлёвых пытаннях.

## Беларусь выступае за ператварэнне АБСЕ ў паўнацэнную міжнародную арганізацыю

**Беларусь выступае за рэфармаванне АБСЕ і яе ператварэнне ў паўнацэнную міжнародную арганізацыю. Аб гэтым у інтэрв'ю часопісу «Союзное государство» заявіў міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.**

«Беларусь не толькі падтрымлівае Расію ў яе імкненні ўдасканальваць дзейнасць АБСЕ, але і разам з Расіяй была ініцыятарам гэтага працэсу. Больш як 10 гадоў мы вядзём гэту работу, — адзначыў міністр. — Пытанне ператварэння АБСЕ ў паўнацэнную міжнародную арганізацыю, якая дзейнічае ў інтарэсах усіх дзяржаў-членаў, з'яўляецца для нас адным з прыярытэтаў у знешнепалітычнай дзейнасці. Мы актыўна працуем з Расіяй у гэтым напрамку, абмяркоўваем гэту тэматыку на сумесных калегіях і кансультацыях».

Паводле слоў Уладзіміра Макея, тэма ўдасканалення работы АБСЕ намнога шырэйшая, чым рэфармаванне БДІПЧ АБСЕ. «Тут размова ідзе аб ператварэнні АБСЕ ў сапраўды міжнародную арганізацыю са сваім статутам, аб удасканаленні дзейнасці інстытутаў і палявых прысутнасцяў АБСЕ, аб змяненні метадаў работы арганізацыі ў сферы чалавечага вымярэння, аб прыняцці шэрагу рашэнняў па адзіных правілах назначэння на кіруючыя пасады АБСЕ, аб вырашэнні пытанняў, якія ўмацоўваюць кансэнсусную прыроду арганізацыі. Гэта вялікі комплекс пытанняў, які патрабуе ўважлівага разгляду», — падкрэсліў ён.

«Разам з тым рэфармаванне арганізацыі з'яўляецца актуальным, таму што непасрэдна датычыцца нашых дзяржаў. Мы адчуваем двайныя стандарты, якія прымяняюцца ў адносінах да краін «на ўсход ад Вены», — заявіў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Беларусі. — Таму пытанні рэфармавання БДІПЧ АБСЕ, сістэмы назірання за выбарамі з'яўляюцца галоўнымі ў плане будучага рэфармавання арганізацыі».

Уладзімір Макей таксама адзначыў, што работа па пашырэнні ідэі рэфармавання гэтай міжнароднай арганізацыі таксама вядзецца ў рамках розных інтэграцыйных утварэнняў на постсавецкай прасторы.

«Пэўныя поспехі ўжо ёсць. Напрыклад, цяперашняе ірландскае старшынства прыняло шэраг мер па ўдасканаленні дзейнасці ў кантэксце чалавечага вымярэння. Сутнасць у тым, каб гэтая дзейнасць адлюстроўвала актуальныя праблемы ва ўсіх краінах — членах АБСЕ, а не толькі ў тых дзяржавах, якія вызначае кіраўніцтва арганізацыі. Звычайна ў ліку такіх аказваюцца краіны постсавецкай прасторы», — сказаў міністр.

«Вядома, мы не маем ілюзій адносна таго, што змены ў дзейнасці АБСЕ адбудуцца хутка, але нацэлены на тое, каб настойліва дабівацца атрымання эфекту ад рэфармавання гэтай арганізацыі разам з нашымі саюзнікамі, у першую чаргу з Расіяй», — дадаў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Беларусі.

## З-ПАД ПІЛЫ — І Ў МУЗЕЙ



Музей драўлянай скульптуры пад адкрытым небам з'явіцца каля Крычава ў 2013 годзе. Яго стварэннем займаецца вядомы крычаўскі скульптар і мастак Дзмітрый ДАБРАВОЛЬСКІ. Паводле задумы аўтара, на тэрыторыі музея размесцяцца больш за 500 скульптур. Акрамя таго, там будзе майстэрня, некалькі альтанак, а ў перспектыве — і казачная сядзіба.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ЛУЗГІН, першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі:**

***«Сітуацыя на рынку міжбанкаўскіх крэдытаў залежыць ад розных фактараў, але думаю, што да канца года рэзкіх змен не будзе. Мы тут ставім сабе дзве мэты. З аднаго боку — не дапусціць рэзкага росту ставак з мэтай недапушчэння стрымлівання ВУП. З другога боку — трэба захоўваць перавагу рублёвых дэпазітаў перад валютнымі, больш высокую іх даходнасць».***

### НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | – 4° |
| Віцебск | – 1° |
| Гомель | – 2° |
| Гродна | – 4° |
| Магілёў | – 2° |
| Мінск | – 2° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.12.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8590,00 | ▼ |
| Еўра | 11170,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 279,50 | ■ |
| Укр. грыўня | 1061,15 | ▲ |

## ЗАРПЛАТА «Ў КАНВЕРЦЕ»: ПЛЮСЫ І МІНУСЫ

**Пра тое, што такое заробак «у канверце», не ведае, мабыць, толькі сямігадовае дзіця. А значыць, гэтая з'ява — не такая ўжо і рэдкасць у нашай рэчаіснасці. Як і ўсё на свеце, яна мае як свае недахопы, так і выгады. Давайце паглядзім, хто пры гэтым атрымлівае найбольшую выгаду і хто часцей за ўсё аказваецца ў пройгрышы.**

### ПРАЦАВАЦЬ — ПРАЦАВАЛІ, А ПЕНСІЯ МІНІМАЛЬНАЯ...

— У нашым горадзе больш за тысячу чалавек атрымліваюць працоўную пенсію ў мінімальным памеры (на 1 снежня — 1.027.545 руб.), — кажа **намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Баранавіцкага гарвыканкама Наталля ФАЛЕЕВА.** — Можна выказаць здагадку, што многія з іх сёння маюць такую нізкую пенсію таму, што атрымлівалі даходы, якія не адлюстроўваліся ні ў якіх дакументах. Гэта значыць, працавалі неафіцыйна: зарплату атрымлівалі, але страхавых узносаў з яе ніхто не выплачваў. Вось і вынік: людзі працаваць — працавалі, але даведак ніякіх пры гэтым даць не могуць...

Сёння кожны з нас, атрымліваючы зарплату, бачыць у разліковым лістку, што ён плаціць з яе 12% падаходнага падатку і 1% — унёсак у пенсійны фонд. Але гэта не значыць, што ў пенсійны фонд ідзе толькі гэты мізэрны працэнт, таму што асноўная падатковая нагрузка кладзецца на прадпрыемства. Яно, акрамя падаткаў на прыбытак, падатку на дабаўленую вартасць і г. д., з кожнага рубля, накіраванага на вашу зарплату, пералічвае ў Фонд сацыяльнай абароны 34%. Менавіта з гэтых 35-працэнтных адлічэнняў (1% ад работніка і 34% ад наймальніка за кожнага свайго работніка) і выплачваюцца дзяржавай пенсіі, аплачваюцца бальнічныя лісткі і г.д.

Вось і атрымліваецца, што наймальнік, выдаючы вам зарплату або частку яе ў канверце, без адлюстравання ў бухгалтарскім уліку і, адпаведна, без выплаты падаткаў і адлічэнняў у Фонд сацыяльнай абароны, «крадзе» пры гэтым значную частку вашай пенсіі. Бо вылічацца яна будзе, зыходзячы менавіта з вашай афіцыйнай зарплаты.

На жаль, многія людзі нярэдка жывуць адным днём, не задумваючыся аб сваёй будучыні. Бо пенсія так далёка... Але прыходзіць яна заўсёды хутчэй, чым мы чакалі.

### ЦІ РОЎНЫЯ ВЫЙГРЫШЫ ПРОЙГРЫШАМ

Але хопіць пра аддаленыя наступствы. Пагаворым аб сённяшніх, імгненных выйгрышах і пройгрышах.

Па словах **начальніка ўпраўлення працы і заработнай платы Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама Алены АЛЯШКЕВІЧ**, памеры і іншых сацыяльных выплат таксама вызначаюцца, зыходзячы з заробку. Так што калі вы атрымліваеце па ведамасці 1-1,5 млн рублёў, то ваш бальнічны ліст, дапамога па цяжарнасці і родах, па доглядзе за хворым членам сям'і і т.п., будуць разлічвацца, зыходзячы з гэтых сум, і выплачвацца з Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Можна, вядома, спадзявацца на высакароднасць свайго працадаўцы, які дакладзе адсутную суму з уласнай кішэні, але разлічваць на такое прыходзіцца далёка не заўсёды, асабліва ў выпадку ўзнікнення на працы нейкай спрэчкі або хоць трохі канфліктнай сітуацыі. Тое ж самае адбудзецца пры налічэнні сярэдняга заробку падчас працоўнага адпачынку і канчатковым разліку пры звальненні.

— Напрыклад, у наш камітэт нядаўна паступіў зварот жыхаркі Мінскай вобласці па пытанні налічэння і выплаты дапамогі па цяжарнасці і родах, — распавядае Алена Аляшкевіч. — Падчас вывучэння матэрыялаў было ўстаноўлена, што згодна з працоўным дагаворам узровень аплаты яе працы складаў не больш за ўстаноўлены ўрадам Беларусі памер мінімальнай заработнай платы. Астатняя частка, па словах жанчыны, выдавалася ёй асабіста ў рукі. Такім чынам, нягледзячы на штомесячны даход у памеры 6 млн рублёў, аплата бальнічнага ліста па цяжарнасці і родах аказалася зусім невысокай, бо пры вылічэнні ўлічваецца афіцыйная заработная плата.

СТАР. 2

## «ЗАЛАТЫ» САБАЧКА

**Маленькі сабачка, якога ўкусіла аса, намаляваны гомельскай школьніцай Дар'яй Чуянавай як ілюстрацыя да аднаго з вершаў Сяргея Міхалкова. Менавіта гэтая работа стала «залатой» для дзяўчынкі.**

Мастацкую бронзу на Міжнародным конкурсе дзіцячага малюнка па творах Сяргея Міхалкова ва ўзроставай катэгорыі 5-8 гадоў атрымала таксама гамяльчанка — Карына Кляўціна. На яе малюнку — медсястра, якая рыхтуецца рабіць укол маленькаму хлопчыку. Як расказала дырэктар дзіцячай школы мастацтваў Гомеля Алена Лапіцкая, у Маскву ўстанова пасылала 15 работ навучэнцаў рознага ўзросту. Але ж увогуле на конкурс «Я аловак з паперай узяў...», абвешчаны Расійскім фондам культуры і прымеркаваны да 100-годдзя з дня нараджэння пісьменніка, з усяго свету паступіла больш за 15 тысяч малюнкаў. З гэтай колькасці дзіцячых работ журы выбрала лепшых і прысудзіла першае месца гамяльчанцы Дар'і Чуянавай, а трэцяе — Карыне Кляўцінай.



Дзяўчынкі вучацца ў выкладчыкаў Кацярыны Бушынскай і Алы Агажэльскай. Выстава лепшых работ і ўзнагароджванне пераможцаў адбыліся ў галерэі Зураба Цэрэтэлі ў Маскве. У цырымоніі ўручэння галоўнага прыза, фарфоравага дзядзькі Сцёпы, браў удзел сын пісьменніка — кінарэжысёр Мікіта Міхалкоў. Усе лаўрэаты і пераможцы конкурсу атрымалі альбом з вершамі паэта Сяргея Міхалкова і малюнкамі ўдзельнікаў конкурсу, а таксама магчымасць пабываць у Траццякоўскай карціннай галерэі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ



### КНДР ПАСПЯХОВА ЗАПУСЦІЛА РАКЕТУ

Паўночная Карэя выдаткавала на запускі дзвюх ракет у 2012 годзе каля 1,3 мільярда долараў. Пра гэта са спасылкай на падлікі паўднёвакарэйскага ўрада паведамляе CNN. Першая з іх у красавіку 2012 года выбухнула ў паветры праз некалькі хвілін пасля старту. Яе абломкі ўпалі ў Жоўтае мора. Другая паўночнакарэйская ракета была паспяхова запушчана раніцай 12 снежня. КНДР абвясціла, што ракета вывела на арбіту спадарожнік.

### УРАД ЛІТВЫ БУДЗЕ ІМКНУЦЦА ЎВЕСЦІ ЕЎРА ДА 2015 ГОДА

Адным з прыярытэтаў новага ўрада Літвы, па словах прызначанага прэм'ера Альгірдаса Буткявічуса, будзе ўвядзенне еўра. Аб гэтым ён сказаў у парламенце падчас прадстаўлення праграмы ўрада, назваўшы 2015-ты магчымым для ўвядзення еўра. У гутарцы з журналістамі Буткявічус не выключыў магчымасці ўвядзення еўра адначасова з Латвіяй, якая збіраецца перайсці на еўрапейскую валюту ўжо ў 2014 годзе, але пры гэтым сказаў, што ўсё пакажа першы квартал наступнага года. Прэм'ер лічыць, што калі Літва не паспее ўвесці еўра ў 2015 годзе, то яна можа ператварыцца ў «захалусную дзяржаву». Разам з тым, многія эксперты лічаць, што Літве не варта спяшацца з увядзеннем еўра, пакуль не вырашыцца пазыковы крызіс у Еўразоне.

### НОВАЯ ЎКРАІНСКАЯ РАДА ПАЧАЛА ПРАЦУ СА СКАНДАЛУ



Першае пасяджэнне новаабранай Вярхоўнай Рады Украіны не абышлося без эксцэсаў: двух дэпутатаў выштурхалі з залы іх жа аднапартыйцы, а ў момант бойкі на месцы падзей з'явіўся «табун патэнцыйных сенатараў» у выкананні напаўголых феміністак скандальна вядомага руху Femen. Нягледзячы на гэтыя інцыдэнты, прынясенне прысягі парламентарыямі адбылося.

ISSN 1990 - 763X

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## АБАМА ПРЫЗНАЎ ПАЎСТАНЦАЎ ЗАКОННАЙ УЛАДАЙ СІРЫІ

**Злучаныя Штаты афіцыйна прызналі Нацыянальную кааліцыю апазіцыйных і рэвалюцыйных сіл Сірыі адзіным легітымным прадстаўніком сірыйскага народа, заявіў у інтэрв'ю тэлеканалу ABC News амерыканскі лідар Барак Абама.**

Каментуючы пазней заяву прэзідэнта, прадстаўнікі адміністрацыі адзначылі, што Вашынгтон не збіраецца ў бліжэйшы час пастаўляць зброю паўстанцам. Абама ахарактарызаваў кааліцыю апазіцыйных сіл як дастаткова «ўсёабдымную і рэпрэзентатыўную», якая ўключае ў сябе розныя арганізацыі і групоўкі, што адлюстроўваюць шырокія інтарэсы сірыйцаў. Прэзідэнт ЗША выказаў надзею, што прызнанне Вашынгтонам апазіцыі законнай сілай стане «вялікім крокам» на шляху да адхілення ад улады Асада. У той жа час Абама адзначыў, што Злучаным Штатам падабаюцца не ўсе людзі, якія ўдзельнічаюць у баявых дзеяннях супраць Асада, таму што некаторыя з іх прытрымліваюцца экстрэмісцкіх і антыамерыканскіх поглядаў. Услед за ЗША легітымнай уладай сірыйскіх паўстанцаў прызнала так званая «Група сяброў Сірыі» на форуме ў Маракешы.

### КОРАТКА

З 31 снежня па 3 студзеня міліцыя, медыкі і ратавальнікі будуць несці службу кругласутачна ва ўзмоцненым рэжыме. Акрамя таго, дадатковыя сілы будуць патруляваць тэрыторыі каля храмаў на каталіцкія і праваслаўныя Каляды.

«Расатам» выканае свае абавязацельствы па будаўніцтве Беларускай АЭС у тэрмін і за тую суму, якая прадугледжана міжурадавым пагадненнем.

Санэпідслужба Мінска з пачатку снежня за неналежнае ўтрыманне тэрыторый у зімовы перыяд распачала 100 адміністрацыйных спраў. Пра гэта паведаміў галоўны санітарны ўрач горада Іван Вайтовіч. Праверкі ў асноўным датычыліся тэрыторый гандлёвых аб'ектаў і грамадскіх будынкаў. Прэтэнзіі прад'яўлены да ачысткі ад снегу і наледзі пешаходных дарожак, а таксама тэрыторый, прылеглых да прадпрыемстваў.

У Полацку 11 снежня супрацоўнікі міліцыі затрымалі аўтамашыну «Форд» пад кіраваннем непрацуючага мясцовага жыхара 1968 года нараджэння. У мужчыны знойдзена і канфіскавана больш за 70 г метадону. Кошт канфіскаванага ацэньваецца ў суму звыш $8 тыс.

Пяць кампаній, якія спецыялізаваліся на розных здзелках з нерухомасцю, з дапамогай афшорных фірмаў, зарэгістраваных на Кіпры, Панаме і Віргінскіх астравах, выкарыстоўваючы фальшывыя дакументы з завышаным коштам залогаў, атрымалі ашуканскім шляхам у малдаўскіх банках крэдыты на суму 10,4 млн еўра.

## ЦІ ЁСЦЬ У ВАШАЙ СЯМ'І ТРАДЫЦЫІ, ЗВЯЗАНЫЯ З НОВЫМ ГОДАМ?



**Андрэй БЫКАЎ, вайсковец кантрактнай службы 387-га цэнтра тэхнічнага кантролю і забеспячэння абароны інфармацыі:**

— У наш дом Новы год прыходзіць з водарам елкі. І хоць мы з братам ужо выраслі, бацька ўсё роўна штогод прыносіць лясную прыгажуню. Затым наступае ўрачыстая «цырымонія» ўпрыгожвання. Верхавінку насаджвае тата, «эстафету» пераймаем мы — вешаем шарыкі. Завяршае «цырымонію» мама, на якую ўскладаецца абавязак развесіць гірлянды і мішуру. Калі будуць свае дзеці, мяркую працягнуць гэтую традыцыю ў сваёй сям'і. Працэс упрыгожвання ёлкі яднае, дае магчымасць папрасіць у родных прабачэння і дараваць крыўды... Без слоў.



**Дар'я ГІРГЕЛЬ, выкладчык кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі БДУ:**

— Новы год — сямейнае свята. Заўжды ўпрыгожваем елку навагоднімі цацкамі, якія куплялі яшчэ мае бацькі. Побач з Дзедам Марозам і Снягуркай пад ёлку абавязкова садзім плюшавага мядзведзіка, якому хутка споўніцца пяцьдзясят гадоў. 31 снежня — дзень нараджэння малодшай пляменніцы. Таму апошні дзень кожнага года наша сям'я адзначанае з падвойнай радасцю. Традыцыяй стала і тое, што да пачатку новага года старэйшы брат купляе насценны каляндар для ўсёй сям'і. У навагоднюю ноч радуем адзін аднаго падарункамі, якія загадзя непрыкметна падкладваем пад ёлку.



**Уладзімір КРАСОЎСКІ, кінолаг:**

— Хутчэй з Калядамі. Я нарадзіўся ў вёсцы. Там жывуць мае бацькі. У глыбінцы яшчэ захавалася традыцыя калядавання. Бывае, збяромся з сябрамі, апранемся ў касцюмы ды забаўляем вяскоўцаў. Спяваем, расказваем вершы, жартуем. Нас заўсёды рады бачыць у кожнай хаце. Таму заўсёды шчодра частуюць. Гэтай традыцыі не хапае ў гарадскім жыцці. Людзі, бывае, нават не вітаюцца са сваімі суседзямі. Што ўжо казаць пра нейкае калядаванне, калі цябе нават на парог могуць не пусціць! Іншая справа — вясковыя жыхары. Можа, як сёння кажуць, яны ў чымсьці крыху і адсталыя, але чыста чалавечых якасцяў у іх не адняць!

**Падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.**

■ Парламенцкі дзённік

# ДЭПУТАТЫ ПРЫНЯЛІ ЗАКОН АБ ДАПАМОЗЕ СЕМ'ЯМ, ЯКІЯ ВЫХОЎВАЮЦЬ ДЗЯЦЕЙ

**На чарговым пасяджэнні першай сесіі Палаты прадстаўнікоў пятага склікання было разгледжана 14 законапраектаў**

### ТОЛЬКІ Ў БОК ПАВЫШЭННЯ

Адным з самых абмяркоўваемых на стадыі падрыхтоўкі стаў праект закона «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей». Савет Міністраў унёс гэты дакумент у ніжнюю палату парламента 3 верасня, а 8 кастрычніка ён быў прыняты ў першым чытанні. Праект прадугледжвае значныя змены ў існуючых мерах па падтрымцы сем'яў з дзецьмі. Па сутнасці, з 1 студзеня 2013 года павінен уступіць у сілу цалкам новы закон, які, на думку дэпутатаў, найбольш адпавядае міжнароднай практыцы, яшчэ больш абараняе інстытут сям'і, адпавядае інтарэсам дзяржавы.

— Умацаванне сацыяльнай абароны сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, стварэнне найбольш спрыяльных умоў для нараджэння другіх і наступных дзяцей у сям'і, стымуляванне заключэння шлюбу — прыярытэтныя кірункі дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі. Асноўнымі мэтамі законапраекта з'яўляецца ўвасабленне ў жыццё гэтых каштоўнасцяў, — прадставіла дакумент калегам **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы Алена ШАМАЛЬ.**

«Пры нараджэнні першага і другога дзяцяці, згодна з новым законапраектам, дапамога застаецца ў ранейшым памеры, — удакладніла пасля сутнасць змен у інтэрв'ю журналістам дэпутат. — Змяняецца разлік дапамогі па доглядзе за дзіцем да 3 гадоў. Больш канкрэтызуюцца сем'і, якія будуць атрымліваць дапамогу на дзяцей старэйшых за 3 гады. Тут застаецца чатыры катэгорыі: сем'і, дзе нехта з бацькоў з'яўляецца інвалідам I і II групы; сем'і, дзе бацька праходзіць тэрміновую вайсковую службу; сем'і, дзе выхоўваюцца дзеці-інваліды, і сем'і, дзе выхоўваюцца ВІЧ-інфіцыраваныя дзеці».

У адпаведнасці з міжнародным вопытам, пераразлік дапамогі па доглядзе за дзіцем да 3 гадоў не будзе адбывацца ў выпадку змяншэння сярэдняга заробку па краіне, ад якога гэтая дапамога залежыць. Пераразлічвацца такая дапамога будзе толькі ў выпадку павышэння сярэдняга заробку. Таксама, у адпаведнасці з міжнародным вопытам, павялічаны тэрміны налічэння дапамогі па цяжарнасці і родах з 2 да 6 месяцаў працы маці (у Расійскай Федэрацыі, напрыклад, гэты тэрмін складае 2 гады).

«Трэба разумець, што, перш чым атрымаць дапамогу, неабходна зрабіць адлічэнні ў Фонд сацыяльнай абароны, — патлумачыла Алена Шамаль. — Грошы трэба зарабіць».

Учора дэпутаты Палаты прадстаўнікоў прынялі законапраект аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, у другім чытанні.

### РЭЗІДЭНТАЎ ТРЭБА ВЕДАЦЬ

У першым чытанні былі прыняты папраўкі ў закон аб свабодных эканамічных зонах. Гэты адзін са шматлікіх законаў, змены ў які дыктуюць падпісаныя Беларуссю міжнародныя дамовы ў межах Мытнага саюза.

— У нас ёсць абавязацельствы па прывядзенні нацыянальнага заканадаўства ў адпаведнасці з міжнародным, — сказаў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Уладзіслаў ШЧЭПАЎ.** — Гэтыя змены будуць прагрэсіўнымі. Яны з'яўляюцца дадатковым крокам да фарміравання Адзінай эканамічнай прасторы для Беларусі, Расіі і Казахстана. Змены дазволяць актывізаваць працу свабодных эканамічных зон, дазволяць дзяржаўным органамі больш эфектыўна ўзаемадзейнічаць у рамках Мытнага саюза.

Мяняецца працэдура рэгістрацыі рэзідэнтаў СЭЗ: пры заключэнні дагавора аб уваходжанні рэзідэнта ў свабодную эканамічную зону, інфармацыя пра гэта будзе заносіцца ў рэестр, які потым патрапіць у інтэрнэт і стане даступным для ўсіх прыватных структур краін Мытнага саюза. «Гэта — вельмі важныя змены, бо даюць больш магчымасцяў у пошуку партнёраў для бізнэсу, — упэўнены Уладзіслаў Шчэпаў. — Магчыма, гэта павялічыць колькасць рэзідэнтаў свабодных эканамічных зон, верагодна, і тэрыторыя СЭЗ будзе пашырана. Заканадаўства Мытнага саюза прагрэсіўнае, і мы набліжаемся да яго».

СЭЗ ствараюцца для таго, каб падтрымліваць беларускі экспарт і прыцягваць замежныя інвестыцыі, нагадаў дэпутат. Калі рэзідэнты СЭЗ у сваёй дзейнасці не забяспечваюць станоўчае сальда гандлёвага балансу альбо не забяспечваюць рэалізацыю экспартаарыентаванай прадукцыі, яны могуць згубіць свой статус. Таму ўсе яны імкнуцца падтрымліваць беларускі экспарт або выпускаць імпартазамяшчальную прадукцыю, што вельмі важна для нашай краіны.

— Рэзідэнтам свабодных эканамічных зон трэба ўлічваць, што з 2017 года многія льготы і прэферэнцыі, якімі яны карыстаюцца, будуць адменены, — дадаў дэпутат. — Гэта будзе зроблена з-за прэтэнзій, якія выказваюць іншыя вытворцы — нерэзідэнты СЭЗ. У рамках Мытнага саюза нам таксама прыйдзецца выконваць абавязкі па адмове ад ільгот. Такім чынам, рэзідэнты свабодных эканамічных зон праз некаторы час патрапяць у больш канкурэнтнае асяроддзе, таму ўжо сёння яны павінны ўдасканальваць сваю дзейнасць.

### ЗАМЕЖНЫХ СТУДЭНТАЎ СТАНЕ БОЛЬШ

Сярод ратыфікаваных законапраектаў вялікую цікавасць дэпутатаў выклікала міжурадавае пагадненне паміж Беларуссю і Туркменістанам аб супрацоўніцтве ў сферы адукацыі. Сёння ў беларускіх ВНУ навучаецца каля 7 тысяч студэнтаў з гэтай сярэднеазіяцкай краіны, і толькі адзін беларус вучыцца ў Туркменістане. Разам з тым, Міністэрства адукацыі Беларусі лічыць вельмі важным пагадненне, якое было падпісана ў красавіку 2012 года і прадугледжвае не толькі навучанне вучняў, студэнтаў, аспірантаў, слухачоў, але і павышэнне кваліфікацыі педагагічных супрацоўнікаў, абмен спецыялістамі, адкрыццё новых устаноў адукацыі.

Пагадненне прадугледжвае квоты для туркменскіх студэнтаў на бюджэтныя аддзяленні ў беларускіх ВНУ. Дэпутаты цікавіліся ў кіраўніцтва Міністэрства адукацыі, ці не закранае гэтае пагадненне інтарэсы беларускіх студэнтаў. Намеснік міністра Віктар Якжык запэўніў, што павелічэнне колькасці замежных студэнтаў у Беларусі толькі на карысць развіццю нашай сістэмы вышэйшай адукацыі, бо гэта павышае яе канкурэнтаздольнасць. Да таго ж дэмаграфічная сітуацыя ў нашай краіне вымушае ВНУ быць зацікаўленымі ў паступленні да іх замежнікаў, інакш яны будуць вымушаны скарачаць свой выкладчыцкі склад — беларускай моладзі з кожным годам становіцца ўсё менш.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■

# ЗАРПЛАТА «Ў КАНВЕРЦЕ»: ПЛЮСЫ І МІНУСЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Калі з'яўляюцца праблемы з выплатай заработнай платы ў «канверце», з залічэннем працоўнага стажу, прадастаўленнем працоўнага водпуску, звяртаюцца ў камітэт і работнікі, з якімі працоўны дагавор (кантракт) не складаўся наогул, — працягвае распавядаць Алена Мікалаеўна. — Так, у наш камітэт паступіў зварот, у якім гаварылася, што работнік адпрацаваў некалькі месяцаў, выконваючы ўсе ўказанні наймальніка, а заработную плату за працу так і не атрымаў. У выніку разгляду звароту было ўстаноўлена, што гэты работнік не быў афармлены ў наймальніка. Такім чынам, у гэтым выпадку работніку для атрымання зарплаты давядзецца даказваць фактычнае допушчэнне яго да працы ў судзе, з прыцягненнем сведак і прадстаўленнем фактаў, якія пацвярджаюць выкананне вызначанай працы. І такія выпадкі не адзінкавыя.

* * *

А калі, не дай Бог, з чалавекам адбудзецца няшчасны выпадак на вытворчасці або здарыцца прафзахворванне, то атрыманне зарплаты «ў канверце» негатыўна адаб'ецца і на страхавых выплатах па абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафзахворванняў.

Якія яшчэ мінусы? «Даход, атрыманы ад заробку «ў канверце», нельга выкарыстоўваць у якасці легальнай крыніцы грашовых сродкаў пры здзяйсненні буйных здзелак, бо ў выпадку перавышэння выдаткаў над прыбыткам з сумы перавышэння з фізічнай асобы будзе ўтрыманы падаходны падатак, — пералічвае Алена Аляшкевіч. — А яшчэ атрыманне зарплаты «ў канвертах» пазбаўляе магчымасці атрымаць у банку неабходную суму крэдыту. Бо пры атрыманні крэдыту ў банку неабходна пацвердзіць сваю плацежаздольнасць, падаўшы даведку аб даходах з месца працы».

«Такім чынам, работнікі, згаджаючыся на зарплату ў канвертах або працу без афармлення працоўнага дагавора, спадзяюцца на шчаслівы збег абставін. Аднак пры гэтым яны пазбаўляюць сябе сацыяльных гарантый», — падводзіць вынік начальнік упраўлення працы і заработнай платы.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### ДЫК КАМУ ГЭТА ВЫГАДНА?

Як бачыце, пакуль што ад зарплаты «ў канверце» суцэльныя мінусы. Як для работніка, так і для дзяржавы, якая недаатрымлівае падаткі. Але ж, калі б зусім не было плюсоў, гэтай з'явы не існавала б. Так, плюсы ў ёй таксама ёсць. У першую чаргу, гэта ў нейкай ступені большая заработная плата. Бо нярэдка працадаўца прапануе работніку на выбар: атрымліваць вось такую суму, але неафіцыйна, альбо меншую, хаця ўсё будзе на законных падставах. І многія работнікі кіруюцца імгненнай выгадай: маўляў, са мной усё будзе добра, я не захварэю, а да пенсіі яшчэ дажыць трэба... Сёй-той яшчэ і радуецца, што плаціць меншы падаходны падатак...

**Факты працы без працоўнага дагавора (без запісу ў працоўнай кніжцы) і атрыманне работнікамі зарплаты «ў канверце», па словах спецыялістаў камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама, рэгулярна выяўляюцца ў сферы гандлю, тэхнічнага абслугоўвання і рамонту аўтамабіляў, будаўніцтва, паслуг таксі.**

Што ж, калі хтосьці жыве толькі сённяшнім днём, яму гэта можа падысці. Вось толькі потым не трэба кусаць локці і папракаць сябе за глупства. На жаль, некаторыя ідуць на зарплату «ў канверце», таму што не ведаюць усіх нюансаў і наступстваў падобнага пагаднення.

Хто атрымлівае адназначную выгаду ў такой сітуацыі, так гэта працадаўца. Яно і зразумела: што значыць выплаціць трэцюю частку ў якасці адлічэнняў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва (ФСАН) з зарплаты ў 1 млн рублёў, і што значыць — з зарплаты ў 4-6 млн рублёў? Розніца немаленькая. А калі работнікаў не адзін-два, а значна больш...

Так, адлічэнні ў ФСАН у нашай краіне немаленькія. Але што прапануюць для выпраўлення сітуацыі, напрыклад, у Беларускім саюзе прадпрымальнікаў і наймальнікаў ім. М.С. Куняўскага? Падзяліць адказнасць па сацыяльным страхаванні паміж наймальнікам і работнікам пароўну. Гэта значыць, прасцей кажучы, каб з работніка ўтрымлівалі з зарплаты ў пенсійны фонд не 1%, як цяпер, а 17%. І, адпаведна, з наймальніка бралі таксама 17%. Міністэрства працы і сацабароны Беларусі такую прапанову не падтрымала.

**Святлана БУСЬКО.**

### СНЕГ ДЛЯ ЧЫГУНКІ НЕ ПЕРАШКОДА

**Беларуская чыгуна аператыўна рэагуе на змяненні ўмоў надвор'я і своечасова расчышчае пуці і стрэлкавыя пераводы ад снегу, што дазваляе забяспечыць рух паяздоў згодна з графікам, паведамілі ў прэсслужбе магістралі.**

Ачыстка ад снегу чыгуначнага палатна з'яўляецца адной з важнейшых задач па забеспячэнні бяспекі руху паяздоў у зімовы перыяд. Спецыялісты ўвесь час адсочваць сітуацыю з умовамі надвор'я, каб у выпадку неабходнасці своечасова накіраваць снегаўборачную тэхніку і работнікаў у раёны, дзе чакаецца снегапад. Беларуская чыгунка мае неабходную колькасць тэхнікі для ўборкі снегу на галоўных, станцыйных і пад'язных пуцях.

Таксама своечасова і якасна вядзецца ўборка снегу і падсыпка саляна-пясчанай сумессю пасажырскіх платформаў на чыгуначных вакзалах.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### У МІНСКУ АДЛАВІЛІ КАЛЯ 3000 БЕЗНАГЛЯДНЫХ КАТОЎ І САБАК

**За 11 месяцаў гэтага года работнікі прадпрыемства «Фаўна горада» адлавілі 1663 безнаглядных сабак і 966 катоў, расказаў начальнік участка па адлове безнаглядных жывёл вышэйзгаданага прадпрыемства Віктар Кастэнка.**

Большасць жывёл, якія трапілі на прадпрыемства, вяртаецца да былых уладальнікаў або набывае новых гаспадароў. Адловам безнаглядных жывёл у сталіцы займаюцца 18 работнікаў прадпрыемства: дзевяць экіпажаў, якія складаюцца з кіроўцы і лаўца. Штодня ў кожным з раёнаў горада працуе адзін экіпаж. Працоўны дзень спецыялістаў па адлове працягваецца з 7.00 да 14.30. Прадугледжаны таксама дзяжурныя экіпажы, якія працуюць у другую і трэцюю змену ў будні, а таксама ў выхадныя.

***«Мінск-Навіны».***

■ Май на ўвазе

# ЗАПЛАЦІ, БО АДКЛЮЧАЦЬ!

**Сёлета больш за 12 тыс. мінскіх кватэр адключалі ад вода- і электразабеспячэння за няплату жыллёва-камунальных паслуг.**

У студзені—кастрычніку гэтага года прыпынялася прадастаўленне жыллёва-камунальных паслуг (ЖКП) за іх няплату ў 12 147 кватэрах. Такія звесткі прывялі ў грамадскім аб'яднанні «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка».

Спецыялісты аб'яднання адзначылі, што ў дачыненні да ўласнікаў і наймальнікаў, якія ўхіляліся ад квартплаты без уважлівых прычын, прымаюцца пэўныя меры ўздзеяння: ім выносяць папярэджанні, прадстаўнікі абслуговых жыллёвых арганізацый і РУУС наведваюць іх дома, натарыусы афармляюць выканаўчыя надпісы, па якіх судовыя выканаўцы ажыццяўляюць спагнанні запазычанасці, работнікі ЖЭС адключаюць ваду і святло, блакіруюць каналізацыю.

Згодна з заканадаўствам, прыпыніць прадастаўленне ЖКП камунальнікі маюць права пасля заканчэння двух перыядаў (месяцаў) запазычанасці. Але перш за ўсё неплацельшчыку накіроўваюць пісьмовае папярэджанне і даюць яшчэ 5 дзён на аплату доўгу. Цікава, што за студзень—кастрычнік такія папярэджанні атрымалі больш за 49 тыс. неплацельшчыкаў, прычым 37 тыс. з іх аператыўна адшукалі неабходныя сродкі і разлічыліся па пазыках.

# ...А ТО І ВЫСЕЛЯЦЬ

**10 наймальнікаў былі вымушаны, згодна з рашэннем суда, пакінуць кватэры за няплату камунальных плацяжоў.**

Ужо больш за 6 месяцаў запазычанасці па аплаце жыллёва-камунальных паслуг (ЖКП) кватэранаймальнікі могуць пазбавіцца жылля (калі ў кватэры не зарэгістраваны непаўналетнія).

Як паведамілі ў грамадскім аб'яднанні «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка», за дзесяць месяцаў гэтага года жыллёвыя арганізацыі падалі ў суд 68 іскаў на перасяленне даўжнікоў у кватэры меншай плошчы або пакоі ў камуналцы (па арт. 71 Жыллёвага кодэкса) і 10 іскаў на высяленне без выдзялення іншага жылля (па арт. 39 гэтага кодэкса — за парушэнне правілаў карыстання жылымі і дапаможнымі памяшканнямі). З іх былі задаволены 8 і 2 іскі адпаведна.

Варта падкрэсліць, што гаворка ідзе пра дзяржаўны жылфонд. Прымяніць такія ж рычагі ўздзеяння да тых, хто пражывае ў прыватызаваных кватэрах, пакуль нельга. Аднак з 2 сакавіка 2013 года, калі ўвойдзе ў сілу новы Жыллёвы кодэкс, кватэры ўласнікаў, якія ўхіляюцца ад квартплаты працяглы час, могуць быць прададзены з аўкцыёну згодна з рашэннем суда, а частка выручанай сумы накіравана на пагашэнне доўгу.

Падрабязней пра меры ўздзеяння на даўжнікоў-уласнікаў можна даведацца з нумара газеты «Вячэрні Мінск», які выйдзе 13 снежня.

***«Мінск-Навіны».***

■ Азбука бяспекі

# ПЕТАРДЫ — НЕ ДЗІЦЯЧАЯ ЗАБАВА

**Надыход навагодніх святаў, як паказвае практыка, нясе з сабой не толькі добрыя настрой і ўражанні. Бестурботнасць, асабліва дзяцей, можа прывесці да трагічных наступстваў.**

— Толькі за першыя дні месяца ўчастковыя інспектары па справах непаўналетніх склалі два адміністрацыйныя пратаколы за дробнае хуліганства



ў дачыненні да непаўналетніх. Адзін з падлеткаў вырашыў паглядзець на рэакцыю іншых дзяцей, якія выходзілі са школы, кінуўшы ім пад ногі запаленую петарду. Другі пайшоў яшчэ далей: закінуў петарду ў акно школьнага кабінета, — паведаміла «Звяздзе» прэс-афіцэр Першамайскага РУУС г. Мінска Вольга Куцько. — Толькі пасля таго, як дзецям патлумачылі, якімі маглі быць наступствы іх учынкаў, стала відавочным, што ім гэта неабыякава, аднак, на жаль, правапарушэнне ўжо было здзейснена.

Супрацоўнікі інспекцыі па справах непаўналетніх Першамайскага РУУС сталіцы правялі ў навучальных установах раёна ўжо больш за 40 прафілактычных размоў з мэтай патлумачыць, якую шкоду можа прынесці неасцярожнае, а тым больш з хуліганскімі памкненнямі, абыходжанне з піратэхнікай. Інспектары спрабуюць данесці на бацькоўскіх сходах гэтую ж думку і да бацькоў. Няхай усе дзеці сустрэнуць навагоднія святы ў коле сям'і, а не, барані Божа, на бальнічным ложку.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### МЕДСЯСТРА ВЫРАТАВАЛА ПЕНСІЯНЕРА, ЯКІ ЛЕДЗЬ НЕ ЗГАРЭЎ У СНЕЗЕ

**У Карэліцкім раёне медсястра выратавала знойдзенага ў снезе пенсіянера, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў цэнтры прапаганды і навучання Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС.**

Праходзячы ўвечары каля лесапаласы, медсястра фельшарска-акушэрскага пункта вёскі Райца звярнула ўвагу на цёмную пляму на снезе, якая дымілася. Аказалася, што гэта быў абгарэлы чалавек. Жанчына паведаміла пра здарэнне старшыні сельсавета і ў раённую бальніцу.

Пацярпелым аказаўся пенсіянер 1947 года нараджэння. Ён шпіталізаваны з апёкамі грудной клеткі і спіны (25% цела). Стан цяжкі, але стабільны. Як мяркуецца, прычына няшчаснага выпадку — неасцярожнасць пры курэнні ў стане алкагольнага ап'янення (хутчэй за ўсё, непатушаная цыгарэта звалілася нецвярозаму мужчыну пад вопратку).

### БРЭСТ — БРЭСТУ

**Аматары геаграфіі ведаюць, што на крайнім захадзе Францыі ёсць горад Брэст. Знаходзіцца ён на ўзбярэжжы Атлантычнага акіяна і ўяўляе сабой буйны ваенны і гандлёвы порт. Адлегласць ад беларускага Брэста да французскага цёзкі — 2300 кіламетраў.**

Яшчэ ў 1990-я гады рабіліся спробы наладзіць кантакты паміж гарадамі. Наш тагачасны мэр Іван Венцаль наведаў з сяброўскім візітам французскага калегу. Потым людзі сыходзілі з пасад, іх пачынанні забываліся.

Але цяпер можна звязацца па інтэрнэце, даведацца больш адзін пра аднаго. Так і пачыналі брастаўчане з абодвух бакоў — з кантактаў турфірмаў. А потым і мэры гарадоў выказалі жаданне пазнаёміцца. Сустрэча адбылася ў Брэсце беларускім. Старшыня гарвыканкама Аляксандр Палышанкоў і мэр французскага Брэста Франсуа-Рэжыс Кюяндр падпісалі рамачны дагавор аб супрацоўніцтве. Гаворка вялася, галоўным чынам, аб развіцці турызму, што можа паслужыць пачаткам трывалых сувязяў паміж гарадамі. Французскія бізнэс-турысты абяцалі арганізаваць маршрут у тым выпадку, калі будзе вырашана пытанне хуткага перасячэння мяжы. Беларускі бок паабяцаў заняцца гэтай праблемай.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

### УЧОРА НА МКАД ЛАВІЛІ... КАРОВУ

**Больш як гадзіну лавілі карову, якая ўчора бегала па Мінскай кальцавой аўтадарозе, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Фрунзенскага раёна сталіцы Алена Волчак.**

«Карову злавілі і вярнулі ў грузавік. Вадзіцель МАЗа прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці за тое, што не прыняў меры да замацавання жывога грузу. Мужчыну абавязалі выплаціць штраф у памеры 0,5 базавай велічыні (Br50 тыс.).

Як паведамлялася, учора каля 14.00 з грузавіка МАЗ, які перавозіў буйную рагатую жывёлу, выпала карова. Гэта адбылося на 34-м кіламетры знешняга кальца МКАД. Спалоханую карову лавілі некалькі чалавек, у тым ліку вадзіцель грузавіка і інспектары ДПС.

### «ДВУХПАВЯРХОВАЯ» ЭКСКУРСІЯ

**У сталіцы нарэшце пачынае працаваць новы экскурсійны маршрут — на двухпавярховым аўтобусе. Яго першы рэйс павінен адбыцца 14 снежня.**

Маршрут нязвыклага для нашых мясцін двухпавярховага транспартнага сродку — ад чыгуначнага вакзала па праспекце Незалежнасці да Нацыянальнай бібліятэкі, далей — па вуліцах Каліноўскага, Кедышкі і Філімонава, зноў па праспекце Незалежнасці, вуліцах імя Веры Харужай і Максіма Багдановіча, праспекце Пераможцаў да «Мінск-Арэны». Адтуль аўтобус пойдзе ў зваротны бок — да ГУМа, а затым па праспекце Незалежнасці — да вакзала. Чакаецца, што працягласць экскурсіі складзе паўтары гадзіны. Турыстам прапануюць яе на нямецкай, іспанскай, італьянскай і французскай мовах.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

### СПАДАРОЖНІКАВЫ «НАВІГАТАР» ДЛЯ БЕЛАРУСКІХ ЗЯЗЮЛЬ

**У наступным годзе наша краіна далучыцца да міжнароднай праграмы па спадарожнікавым назіранні за звычайнай зязюляй. Як паведамілі рэдакцыі ў грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны», гэты праект будзе рэалізоўвацца ў 2013 годзе ў трох краінах — Беларусі, Германіі і Вялікабрытаніі.**

У межах праекта ў Беларусі плануецца сачыць за перамяшчэннем 8 зязюль пры дапамозе спецыяльных датчыкаў на целах птушак. Гэтыя датчыкі перадаюць інфармацыю аб месцазнаходжанні крылатых вандроўнікаў у рэжыме рэальнага часу, што дазваляе адсочваць шляхі іх міграцыі і месцы зімовак. Дзякуючы малой масе датчыка (менш чым 5 г) прыбор не прычыняе нязручнасці птушкам. Кіраўніцтва АПБ плануе, што ўсе аматары птушак атрымаюць магчымасць назіраць за палётам такіх зязюль у рэжыме анлайн на спецыяльна створаным для гэтых мэт сайце.

Спадарожнікавае назіранне за зязюлямі ажыццяўляецца ў Вялікабрытаніі ўжо некалькі гадоў. За гэты час навукоўцы даведаліся шмат новага аб крылатых гэтага віду. У прыватнасці, тое, што на месцах гнездавання зязюлі праводзяць менш за два месяцы за сезон, а астатні час мігрыруюць ці жывуць на месцах зімоўкі.

Колькасць зязюль у Еўропе памяншаецца, бо там практыкуецца інтэнсіўная сельская гаспадарка. Гэтыя птушкі харчуюцца буйнымі вусенямі, якіх на палях стала значна менш. У Беларусі сітуацыя больш спрыяльная дзякуючы наяўнасці вялікіх плошчаў малапарушаных угоддзяў і лясных экасістэм.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### ЗВАЛІЎСЯ ВЕЖАВЫ КРАН

**У цэнтры Гомеля зваліўся вежавы кран, які абрынуў вароты і некалькі бетонных фрагментаў агароджы прыватнага дома.**

Як расказала інспектар аддзялення агітацыі і прапаганды УДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама Вольга Рэзвякова, незвычайнае ДТЗ адбылося на вуліцы Кніжнай. Кіроўца цягача (апошні, дарэчы, рухаўся заднім ходам) перавозіў вежавы кран, які належыць будаўнічаму трэсту № 14. Ён не пераканаўся ў бяспецы манеўру, і кран абрынуўся. На шчасце, абышлося без пацярпелых. На кіроўцу складзены адміністрацыйны пратакол.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### СКАСАВАЛІ КАНТРАКТ ЗА ДАДАТКОВЫ ЗАРОБАК

**Кіраўнік аднаго з падраздзяленняў гомельскай міліцыі за апошнія два гады рэалізоўваў на тэрыторыі Беларусі тэхнічныя сродкі прэстыжных марак.**

Як расказаў начальнік галоўнага ўпраўлення ўласнай бяспекі МУС Рэспублікі Беларусь Юрый Панамарэнка, высветлілася, што пры дапамозе свайго сябра ў ЗША ён знаходзіў транспартныя сродкі і змяшчаў аб'яву пра іх продаж у інтэрнэце. Калі знаходзіўся пакупнік, займаўся дастаўкай і пастаноўкай на адпаведны ўлік. Дакладна вядома, што чатыры катары і два аўтамабілі праз пасрэдніцтва міліцыянера набылі новых гаспадароў у нашай краіне. У выніку праверкі ўстаноўлена, што супрацоўнік міліцыі, з'яўляючыся службовай асобай, у парушэнне артыкула №17 Закона Рэспублікі Беларусь «Пра барацьбу з карупцыяй» займаўся прадпрымальніцкай дзейнасцю, звязанай з рэалізацыяй на тэрыторыі Беларусі катараў і аўтамабіляў, што і з'явілася падставай для датэрміновага скасавання кантракта.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

# ДЗЁННІК ЭЛЕКТРОНІКА — ПЛАТНАЯ ПАСЛУГА

**У Магілёве настаўнікі і вучні асвойваюць навінку — электронныя дзённікі. За 20 тысяч рублёў у месяц бацькі могуць даведацца на інтэрнэт-сайце пра ўсе поспехі і хібы вучобы сваіх дзяцей.**

Любімая забава школьнікаў-двоечнікаў — адзін дзённік для педагогаў, а другі — для бацькоў, цяпер не мае сэнсу. Як і вывядзенне дрэнных адзнак гумкамі, выпаркамі, яйкамі і іншымі больш сучаснымі карэктарамі.

— Аказалася, што ў некаторых вучняў ёсць і трэці дзённік — для падстрахоўкі! — жартуе кіраўнік праекта электронных дзённікаў у магілёўскім таварыстве «Твар да твару» Павел Казакевіч.

У эпоху новых інфармацыйных тэхналогій папяровыя дзённікі мяняюцца на электронныя, і ўсе адзнакі, добрыя і не вельмі, даступны бацькам на інтэрнэт-сайце. Сам Павел Казакевіч некалькі гадоў таму напісаў дыпломную работу ў Беларуска-Расійскім універсітэце пра электронныя дзённікі, якія ўкаранёны ў еўрапейскіх навучальных установах і пачынаюць распаўсюджвацца ў Расіі. Цяпер прыватная фірма падтрымала гэты праект у Беларусі. Зараз ёсць сайт — sdo.by, які абслугоўвае электронныя дзённікі. Там жа можна ўбачыць іх дэманстрацыю.

— Сёння мы абслугоўваем 6,5 тысячы электронных дзённікаў, — расказаў Павел. — З намі працуе больш дзясятка навучальных устаноў у Магілёве, а таксама і ў іншых абласцях.

Гэтыя дзённікі не каштуюць грошай навучальным установам, але кіраўніцтву і настаўнікам выпадае арганізаваць працу. Схема, патлумачылі ў фірме, даволі простая: настаўнікі выстаўляюць адзнакі за дзень у спецыяльны бланк, а пасля класны кіраўнік альбо лабарант пераносіць усе звесткі на электронную старонку.

Найбольшую цікавасць такія дзённікі маюць, вядома, для бацькоў. Паслуга для іх платная. Першы месяц дзённікам можна карыстацца бясплатна, потым — 20 тысяч рублёў на месяц. Калі няма пастаяннага доступу да інтэрнэт-сайта, то звесткі могуць падавацца бацькам у выглядзе СМС-паведамленняў на тэлефон. Такая паслуга будзе каштаваць крыху даражэй — 27 тысяч рублёў.

— Дзённік можа стаць сродкам зносін настаўнікаў і бацькоў, — лічыць Павел Казакевіч. — Таму мы бачым зацікаўленасць нашым праектам у многіх навучальных установах. І ўжо ідзём далей: ствараем цяпер сацыяльную сетку для навучэнцаў, праз фільтры якой не пройдзе інфармацыя, якая супярэчыць законам і маральна-этычным нормам.

Электронны кантроль, зразумела, мала вітаюць самі школьнікі, гімназісты і ліцэісты. Але тэхнічныя навінкі, якія яшчэ ўчора здаваліся фантастыкай, пастуова ўваходзяць у наша штодзённае жыццё, і дзеці маральна прывыкаюць, што электроннае вока сочыць за імі. Урэшце, і ў электронных дзённіках можна знайсці перавагі: напрыклад, дакладныя звесткі пра хатнія заданні, якія паленаваўся запісаць.

У сваю чаргу фірма «Твар да твару» вырашыла паказаць вучням перавагі адлюстраванага ў электронных дзённіках добрага навучання і паводзін. Ва ўстановах, дзе яны ўкараняюцца, узнагародзілі лепшых вучняў граматамі і каштоўнымі падарункамі ў выглядзе флэш-картак.

**Ілона ІВАНОВА.**

■ Як жывяце, землякі?

У РЭГІЁНЕ

Брэстчына

## ЧАС ДАСТАВАЦЬ КАНЬКІ

**У Брэсце пачынаюць заліваць лядовыя пляцоўкі для дзяцей. У дварах некаторых школ ужо з'явіліся такія пляцоўкі. А ўсяго іх запланавана зрабіць 12**

Паводле інфармацыі аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму гарвыканкама, распачата работа па ўсталяванні лядовых пляцовак на тэрыторыі школ №№5, 16, 23 і 2-ой гімназіі. Будуць такія аб'екты і ў жылых масівах, напрыклад, у раёне вуліц Гаўрылава, Брэсцкіх дывізій, Набярэжнай імя Ф. Скарыны. Каля Лядовага палаца, дзе традыцыйна заліваецца вялікі каток, сёлета будзе яшчэ адзін. З'явіцца пляцоўка і ў раёне вуліцы Янкі Купалы. Фінансуюць зімовы праект як аддзелы адукацыі, так і камунальная гаспадарка.

**Яна СВЕТАВА.**

Віцебшчына

## ЛЕПШУЮ МАЛАДУЮ СЯМ'Ю ВЫБЕРУЦЬ У ВІЦЕБСКУ

**Пра гэта карэспандэнту БелТА паведаміла начальнік аддзела па справах моладзі Віцебскага гарвыканкама Людміла Кліменчанка**

У творчым спаборніцтве «Тата, мама, я — дружная сям'я!» прымуць удзел па дзве сям'і ад кожнага раёна абласнога цэнтра (Кастрычніцкага, Першамайскага і Чыгуначнага), якія прайшлі папярэднія адборачныя туры. У ходзе выканання конкурсных заданняў бацькам і дзецям трэба творча прадставіць сваю сям'ю, разам намаляваць і абараніць сямейнае «фота». Інтэлектуальны і музычны конкурсы ўключаюць пытанні на веданне дзіцячых песень і казак. Цікавымі абяцаюць таксама стаць заданні для бацькоў «Танцы на паркеце» і «Радзільня». Першы з іх прадэманструе харэаграфічныя здольнасці дарослых членаў сем'яў, а другі пакажа, наколькі добра і без слоў яны разумеюць адзін аднаго. У адпаведнасці з задумкай конкурсу, кожная з мам зноў апынулася ў радзільным доме і вымушана жэстамі растлумачыць мужу, хто нарадзіўся і на каго падобны. Зыход гэтага конкурсу залежыць шмат у чым ад кемлівасці тат.

Гродзеншчына

## У ГРОДНЕ ПАЗБАЎЛЯЮЦЦА АД «АЎТАХЛАМУ»

**З 462 кінутых на вуліцах і ў дварах аўтамабіляў у абласным цэнтры ўжо прыбрана 325**

Са студзеня г.г. дзейнічае Указ Прэзідэнта Беларусі, які дазваляе ачысціць двары і дарогі населеных пунктаў ад транспартных сродкаў, што аказаліся непатрэбнымі іх гаспадарам. Гэтая працэдура даволі працяглая. Спачатку ЖЭС інфармуе аб месцах знаходжання такіх машын раённае жыллёва-эксплуатацыйнае прадпрыемства, потым гэтыя звесткі перадаюцца ў адміністрацыю раёна, а адтуль — у Дзяржаўтаінспекцыю, якая адводзіць 15 дзён на пошук уладальніка аўтамабіля — яму даецца месяц на прыняцце мер. Калі ж машына не прыбіраецца, яна змяшчаецца на штрафную стаянку, адкуль на працягу трох месяцаў яе можна забраць. І калі гэта не робіцца, суд выносіць рашэнне аб прызнанні транспартнага сродку безгаспадарным з далейшай утылізацыяй на прадпрыемстве «Другчармет». Пры гэтым усе расходы за эвакуацыю і знаходжанне на штрафстаянцы кампенсуе гаспадар машыны.

Як правіла, пераважная частка «аўтахламу» была вывезена на ўтылізацыю самімі ўладальнікамі. Аднак у многіх выпадках не абышлося без спецыяльнай тэхнікі (пагрузчыкаў і эвакуатараў), бо на машынах не было колаў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

У РЭГІЁНЕ

Гомельшчына

## АДПАЧЫЛІ І ЗАРАБІЛІ

**Амаль 17 тысяч маладых людзей Гомельскай вобласці былі задзейнічаны ў працоўным семестры 2012 года**

Гэта на 6 тысяч больш, чым летась, паведаміла камісар Гомельскага абласнога штаба студэнцкіх атрадаў рэгіянальнага камітэта грамадскага аб'яднання БРСМ Вераніка Слуцкая.

Усяго на Гомельшчыне былі створаны 194 працоўныя атрады рознага профілю, у тым ліку 55 будаўнічых, 46 сельскагаспадарчых, 31 сэрвісны, 28 педагагічных, 21 экалагічны. Большая частка будатрадаў працавала на тэрыторыі нашай краіны. У прыватнасці, юнакі і дзяўчаты працавалі ў складзе атрадаў рознага профілю на аб'ектах і прадпрыемствах паўднёва-ўсходняга рэгіёна краіны, адзін будаўнічы атрад — на рамонце ўчастка чыгункі ў Гродзенскай вобласці.

За межамі рэспублікі дзейнічалі 13 атрадаў (328 чалавек). Так, студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту ў складзе будаўнічых атрадаў узводзілі алімпійскія аб'екты ў Сочы, участкі чыгункі ў Забайкаллі, а будатрадаўцы з сэрвісных і сельскагаспадарчых атрадаў працавалі ў Маскоўскай вобласці і Краснадарскім краі.

Вераніка Слуцкая адзначыла, што большасць (каля 10,5 тыс.) працаўладкаваных летам хлопцаў і дзяўчат — гэта юнакі і дзяўчаты ва ўзросце да 18 гадоў. Акрамя таго, сёлета моладзевая арганізацыя знайшла занятасць і для 1129 цяжкіх падлеткаў.

У залежнасці ад спецыфікі працы, умоў знаходжання і колькасці адпрацаваных дзён заработная плата моладзі складала ад Br1 млн да Br3,5 млн.

**Антон ЗАПОЛЬСКІ.**

У РЭГІЁНЕ

Магілёўшчына

## БІТВА ДЗЕДАЎ МАРОЗАЎ

**У Магілёве адбудзецца гарадскі навагодні конкурс на лепшых Дзеда Мароза і Снягурку**

нежня публіку запрашаюць на Савецкую плошчу, дзе разгорнецца спаборніцтва паміж навагоднімі персанажамі з розных клубных і навучальных устаноў абласнога цэнтра. Удзельнікі конкурсу прадставяць свае праграмы, дзе будуць гульні з гледачамі і навагоднія песні. Заяўкі на ўдзел прымаюцца ў Магілёўскім гарадскім цэнтры культуры і вольнага часу.

Лепшым Дзеду Марозу і Снягурцы ўручаць дыплом і грошы — 4 базавыя велічыні. Прэміі ў тры базавыя велічыні маюць шанц атрымаць навагоднія пары, якія будуць лепей за ўсіх спяваць і танцаваць, а таксама самыя спартыўныя, самыя вясёлыя і самыя арыгінальныя Дзед Мароз і Снягурка.

**Ілона ІВАНОВА.**

■ Учора

# ДА ЧЫТАЧОЎ... З ЛЮБОЎЮ!

**КАЛІ верыць у розныя прымхі, гэтая падпісная кампанія можа стацца ўдалай. Хаця б таму, што чарговы Дзень падпісчыка Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белпошта» прызначыла на 12-га 12.12... Больш за тое — распачало яго ў 12 гадзін 12 хвілін.**







Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.



**НА ЗДЫМКАХ: тры пакаленні чытачоў у адной сям'і — Марыі Мікалаеўны Падліпскай; цікавым падаўся наш стэнд пастаяннай падпісчыцы газеты Аксане Уладзіміраўне Камінскай; госці «Звязды» — намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Таццяна Мікалаеўна Гвоздзева і начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ Аксана Мікалаеўна Чычко.**

Але ж спачатку трэба, відаць, адзначыць, што ўсіх кліентаў паштамта ў гэты дзень віталі чароўныя Снягуркі, што ў цэнтры вялікай круглай залы красавалася казачна прыгожая ёлка, што побач з ёю ўсталявана адмысловая скрынка для лістоў Дзядулю Марозу, што пакуль, вядома ж, не позна замовіць традыцыйнае віншаванне ад гэтага чараўніка і нават візіт яго (у тым ліку на 30-31-га снежня)... Што там жа, на паштамце, працуе кірмаш, дзе можна купіць прыгожыя паштоўкі, наборы, канверты. І, вядома ж, аформіць падпіску. На што?

Відаць было, што нехта з кліентаў пошты прыглядаўся да стэндаў (а прадстаўлены былі ці не ўсе рэспубліканскія выданні) — магчыма, выбіраў? Большасць жа гасцей ішло напрасткі — да сваіх.

— «Звязду» для сябе я адкрыла недзе ў 1975-м і, можна сказаць, пад прымусам, — з усмешкай успамінала наша госця **Аксана Уладзіміраўна КАМІНСКАЯ.** — Хацела падпісацца на часопісы «Вокруг света», «Крестьянка». А да іх нагрузка была ў выглядзе нейкай з газет... Выбрала — беларускую. З таго часу і прыкіпела. Ад іншых выданняў на нейкі час адмаўлялася, мяняла іх на новыя, а «Звязда» — гэта ўжо, відаць, назаўсёды... Не магу адказаць, чаму? Прыцягвае, вядома ж, наша мова, імёны журналістаў — Ляўковіч, Кляшчук, Свістуновіч, Доўнар... Вабіць разнастайнасць тэм і пазітыў... Да таго ж для сябе я цэлы том стварыла са звяздоўскай «Хатняй энцыклапедыі».

Што падалося цікавым, Аксана Уладзіміраўна не прапускае ў газеце нават рэкламныя артыкулы. А вось ад звяздоўскага штодзённіка ў якасці прыза — адмовілася. І, так бы мовіць, наадрэз! Сказала: «Няхай падарункі дастаюцца тым, хто, можа, у першы раз падпішацца. Бо трэба ж, каб нас было больш?»

Прыемна, згадзіцеся, што гэта — клопат не толькі рэдакцыі, але і падпісчыкаў. Якія, дарэчы, з цікавасцю разглядвалі выстаўленыя на звяздоўскім стэндзе часопісы «Полымя», «Маладосць», «Нёман», «Вожык». Ды яшчэ і дзівіліся: «Моладзь піша пабеларуску?! Цікава. Трэба пачытаць». «А што — «Вожык» наш яшчэ жывы?.. «Крокодила» ж, як быццам, няма ўжо?», «А хто рэдактарам у «Нёмане»?.. Прыйшлося распавядаць, як кажуць, «не толькі за сябе, але і за таго хлопца», бо «Звязда» цяпер гэта яшчэ «Выдавецкі дом «Звязда», які выдае беларускія літаратурна-мастацкія часопісы.

Гісторыя новага выдавецкага дома яшчэ толькі пачынаецца. Што датычыцца газеты, то яна як перадавалася ад бацькоў да дзяцей, так, спадзяёмся, і будзе. Прыкладам таму сям'я Падліпскіх з Мінска, якая на гэтую чарговую сустрэчу прыйшла ў поўным складзе: «Звязду» ў спадарожніцы жыцця выбрала некалі бабуля. А чытаюць яе ўсе, у тым ліку і ўнучка-сямікласніца, Настасся, якая, дарэчы, вельмі хораша гаворыць па-беларуску. Дзякуючы газеце!

А вось яшчэ адна наша адданая падпісчыца Таццяна Ерафееўна Мацкевіч са сваім унукам размаўляць на роднай мове яшчэ толькі пачынае:

— Маленькі ён, — усміхалася жанчына, — другі годзік пайшоў. Днямі дачка сфатаграфавала. Ён першы раз у сваім жыцці снег убачыў. Такі цуд у вачанятах!.. Шкада, што не Кляшчук здымаў. У яго б, відаць, сапраўдны шэдэўр атрымаўся!.. Вельмі люблю яго здымкі. І альбом абавязкова куплю.

Ён, гэты фотаальбом «Беларусь. Зямля песняроў» быў, вядома ж, на стэндзе. Як і новая кніга, складзеная са звяздоўскай «Простай мовы». Праўда, яны не прадаваліся (купіць можна ў кнігарнях)...

А яшчэ (і як заўсёды) сваіх падпісчыкаў, сваіх сяброў-паштавікоў і калег «Звязда» частавала. Каго — любімымі цукеркамі, каго — цудоўным хлебам з... салам. Хлеб мы купілі па дарозе, а вось сала (ды не простае, а з кубельца!) прыслалі падпісчыкі з Ганцавіччыны.

— Нам пераважна скаргі шлюць, — зайздросцілі калегі з іншых выданняў. — Добра вам.

...Як усім, дададзім, каго любяць.

І, вядома ж, хто — любіць.

**Валянціна ДОЎНАР**

■ Ваша бяспека

## ДЗЯРЖАЎТАІНСПЕКЦЫЯ РЭКАМЕНДУЕ ЎСТРЫМАЦЦА АД ПАЕЗДАК НА ДАЛЁКІЯ АДЛЕГЛАСЦІ

**ПА прагнозах сіноптыкаў, у бліжэйшыя дні і без таго няпростая дарожная сітуацыя значна ўскладніцца: чакаецца снег, у асобных раёнах моцны, на дарогах галалёдзіца, тэмпература паветра ад 0 удзень да мінус 12 градусаў уначы, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.**

Менавіта таму ДАІ рэкамендуе вадзіцелям адкласці паездкі на далёкія адлегласці. Тым, хто ўсё ж сеў за руль, трэба быць вельмі пільнымі, выбіраць хуткасны рэжым, зыходзячы з умоў надвор'я, стану праезнай часткі і дарожнай абстаноўкі, павялічыць дыстанцыю бяспекі і няўхільна выконваць правілы праезду пешаходных пераходаў.

Паколькі шматлікія транспартныя сродкі могуць быць не гатовымі да ўдзелу ў дарожным руху ў моцны мароз, Дзяржаўтаінспекцыя просіць усіх кіроўцаў звярнуць увагу на зарадку акумулятара, а таксама стан свечак напалу ў дызельных аўтамабілях, праверыць эфектыўнасць тармазной сістэмы, падвеску і рулявое кіраванне, забяспечыць добрую работу сістэмы ацяплення і вентыляцыі салона, праверыць спраўнасць фар, габарытных агнёў і стоп-сігналаў, замяніць шклоачышчальнікі, а абмывальнік ветравога шкла заправіць спецыяльнай незамярзальнай вадкасцю.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У сувязі са складанымі ўмовамі надвор'я і рэзкім пахаладаннем да выхадных, якое захаваецца і на наступным тыдні, у Беларусі арганізаваны кругласутачны маніторынг стану вулічна-дарожнай сеткі на прадмет своечасовага выканання дарожнымі і камунальнымі службамі работ па прыборцы снегу. Пры абвастрэнні дарожнай сітуацыі экіпажы ДАІ будуць праводзіць патруляванне з уключанымі сінімі праблісковымі маячкамі для прыцягнення ўвагі ўдзельнікаў дарожнага руху і папярэджання аварыйных сітуацый.

Толькі за мінулыя суткі на дарогах Беларусі зарэгістравана 418 ДТЗ з матэрыяльным уронам. Здзейснена 15 ДТЗ, у якіх 17 чалавек атрымалі раненні. Усяго за суткі было затрымана 66 вадзіцеляў, якія адправіліся ў дарогу ў стане алкагольнага ап'янення, за перавышэнне хуткасных рэжымаў руху аштрафавана 276 вадзіцеляў. Прыцягнута да адказнасці за парушэнне правілаў дарожнага руху 980 пешаходаў, з іх 495 — за адсутнасць святлоадбівальных элементаў у цёмны час сутак



Дарагая наша, любая **Наталія Лявонцьеўна ВІЦЬКО** з г. Мінска! Віншуем **з юбілеем**. Моцнага здароўя, сямейнага шчасця, поспехаў у працы. Мы цябе любім.

**З павагай твае родныя.**

## Мінск: 12.12.12

### У сталічных ЗАГСах учора зарэгістравалі 131 шлюб



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Мінску ў дзень трох тузінаў — 12.12.12 — сямейнымі вузамі сябе вырашыла звязаць 131 пара. Для серады гэта немалая колькасць.

Мода на прыгожыя вясельныя даты прыйшла да нас у нулявыя гады. Асабліва багатымі на вяселлі аказаліся 2008-ы і 2011-ы. Тады вузамі Гіменея звязалі сябе больш за 300 пар. Цяперашняя тройца — 12.12.12 — апошняя ў XX! стагоддзі. Больш за ўсё шлюбаў зарэгіструюць у ЗАГСе Маскоўскага раёна. «Мы прынялі 25 заяў ад будучых маладажонаў», — расказала начальнік аддзела ЗАГС адміністрацыі Маскоўскага раёна Наталля Філімонава. Па 20 шлюбаў зарэгіструюць у ЗАГСах Заводскага і Кастрычніцкага раёнаў, 18 — у ЗАГСе Партызанскага раёна. У ЗАГСе Ленінскага раёна 13 з 16 рэгістрацый пройдуць ва ўрачыстых абставінах. А вось жыхары Савецкага і Фрунзенскага раёнаў да прыгожай камбінацыі лічбаў на календары паставіліся спакойна. У ЗАГСах гэтых раёнаў зарэгіструюць дзве і адну пары адпаведна.

Дарэчы, паводле статыстыкі, вясельная дата, якая складаецца з трох аднолькавых лічбаў, зусім не гарантуе трываласці сямейных вузаў. Напрыклад, у Маскоўскім раёне з 30 пар, якія ўзялі шлюб 07.07.07, пяць развяліся. 09.09.09 было зарэгістравана 8 шлюбаў, тры ўжо распаліся. І нават з 33 пар, якія пажаніліся 11.11.11, адна ўжо развялася.

*«Мінск-Навіны».*

**Шаноўныя сябры!**

**Працягваецца падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2013 года!**

**Спадзяёмся бачыць вас сярод нашых чытачоў і падпісчыкаў і ў наступным годзе. А напярэдадні навагодніх святаў хочам нагадаць вам, што падпіска на «родную газету на роднай мове» можа стаць добрым падарункам родным вам людзям!**

| Індэкс/перыяд | | 1 месяц | 3 месяцы | 6 месяцаў |
|---|---|---|---|---|
| 63850 | (для індывідуальных падпісчыкаў) | 33 000 | 99 000 | 198 000 |
| 63145 | (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў) | 29 700 | 89 100 | 178 200 |
| 63858 | (для ведамасных падпісчыкаў) | 61 000 | 183 000 | 366 000 |
| 63239 | (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя) | 54 900 | 164 700 | 329 400 |

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

■ У краіне

# РАЗМЕРКАВАННЕ ВЫПУСКНІКОЎ УЗМАЦНЯЕ ГАРАНТЫІ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ МАЛАДЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

**ТАКОЕ меркаванне выказала міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна на Міжнароднай канферэнцыі па пытаннях годнай працы, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Практычна кожны чацвёрты заняты ў эканоміцы Беларусі (24%) — моладзь ва ўзросце да 31 года. Маладых людзей у нашай краіне налічваецца крыху больш за 2 млн чалавек (амаль 22% насельніцтва). Найбольшая ўдзельная вага моладзі ў структуры працуючых адзначаецца ў такіх відах эканамічнай дзейнасці, як агульная камерцыйная дзейнасць па забеспячэнні функцыянавання рынку (41,5%), інфармацыйна-вылічальнае абслугоўванне (37%), гандаль і грамадскае харчаванне (33,8%), фінансы, крэдыт і страхаванне (31,5%), будаўніцтва (30,5%), культура (27,3%).

У агульнай колькасці беспрацоўных маладыя людзі складаюць 43%, прычым іх доля пастаянна змяншаецца (для параўнання: у 2000 годзе было 52%). Працягласць моладзевага беспрацоўя таксама пастаянна зніжаецца і сёння складае ў сярэднім менш за тры месяцы.

«Моладзь — найбольш перспектыўная група ў складзе працоўных рэсурсаў: ёй уласцівая энергічнасць, хуткая навучальнасць, добрыя фізічныя паказчыкі, — сказала Марыяна Шчоткіна. — Разам з тым у Беларусі моладзь, якая ўпершыню выходзіць на рынак працы і якая не мае прафесіі або дастатковага ўзроўню прафесійных навыкаў, як і ва ўсіх краінах свету, адносіцца да адной з уразлівых груп насельніцтва. Паспяховы старт на рынку працы — ключавая ўмова, якая вызначае ўдзел моладзі ў жыцці грамадства і яе ўплыў на грамадскае развіццё».

Міністр адзначыла, што ключавымі напрамкамі дзеянняў па вырашэнні праблем занятасці з'яўляюцца прадастаўленне магчымасці атрымання прафесіі, стварэнне працоўных месцаў, стымуляванне развіцця моладзевага прадпрымальніцтва, а таксама наймальнікаў, працаўладкоўваецца моладзь на часовыя працоўныя месцы. «Дзяржава дае гарантыі першага рабочага месца выпускнікам навучальных устаноў, якія навучаюцца за кошт бюджэтных сродкаў, — падкрэсліла Марыяна Шчоткіна. — Гэта спрыяе паляпшэнню кадравага забеспячэння найважнейшых галін эканомікі і адначасова ўзмацняе гарантыі сацыяльнай абароны маладых спецыялістаў».

**Паспяховы старт на рынку працы — ключавая ўмова, якая вызначае ўдзел моладзі ў жыцці грамадства**

У мэтах замацавання маладых кадраў на сяле маладым спецыялістам, якія прыбылі на працу ў сельгасарганізацыі, на працягу першых двух гадоў робіцца даплата да заробку ў памеры тарыфнай стаўкі першага разраду, пры далейшай працы даплата павялічваецца ў тры разы на наступныя тры гады. Тарыфныя стаўкі (аклады) маладых спецыялістаў арганізацый аховы здароўя, адукацыі, культуры, фізічнай культуры і спорту, сацыяльнага абслугоўвання, размешчаных у сельскай мясцовасці, дадаткова павышаюцца на 20%.

Акрамя таго, наймальнікі могуць павялічыць тарыфныя стаўкі (аклады) маладых спецыялістаў па такіх падставах, як стаж працы ў галіне, праца па кантракце, наяўнасць акадэмічнай ступені магістра, у сувязі з завяршэннем з адзнакай навучання ў вядучых ВНУ краіны (памеры павышэнняў — ад 10% да 50%).

Дарэчы, у студэнцкіх атрадах устаноўлены ўмовы аплаты працы, якія прадугледжваюць павышаныя памеры (ад 10% да 30%) у параўнанні з аплатай працы па аналагічных прафесіях і пасадах. «У Беларусі моладзі прадастаўлены ўсе магчымасці для ўдзелу ў вырашэнні задач сацыяльна-эканамічнага развіцця, стымулююцца ініцыятывы, — лічыць Марыяна Шчоткіна. — Прэзідэнтам і ўрадам аказваецца дзяржпадтрымка таленавітай і адоранай моладзі». Так, маладыя таленты заахвочваюцца гранд-прэміямі, заахвочвальнымі прэміямі, стыпендыямі, прысуджэннем званняў лаўрэата і дыпламанта. За 1996—2012 гады са спецыяльнага фонду выплачана больш як 3 тысячы заахвочванні. Пры гэтым тарыфныя аклады павышаюцца на 50%, што павялічвае заработную плату маладых таленавітых людзей у сярэднім на 25-30%

■

■ У свеце

# НАД СІРЫЯЙ ЗГУШЧАЮЦЦА ХМАРЫ



**НАГАДАЮ, што ў час знаходжання ў Турцыі Уладзімір Пуцін заявіў: «Мы не адвакаты дзейнага сірыйскага кіраўніцтва, мы заклапочаны іншым, што будзе ў будучыні, мы не хочам паўтарэння памылак, якія былі зроблены ў нядаўнім мінулым». Падобнай пазіцыі прытрымліваецца і Кітай. На думку высокапастаўленых прадстаўнікоў і Расіі, і Кітая, падзеі ў Лівіі не павінны паўтарыцца ні ў Сірыі, ні ў адной іншай краіне. Тады, папрасіўшы расійскую і кітайскую дэлегацыю прагаласаваць за рэзалюцыю ў ААН, якая прадугледжвае знешняе ўмяшанне ў лівійскія падзеі, Захад пасля выкарыстаў гэту рэзалюцыю зусім для іншых дзеянняў — агрэсіўных і захопніцкіх.**

І Расія, і Кітай не хочуць, каб паўтаралася былая тэндэнцыя — пасля ўмяшання Захаду, які заяўляў, што пэўныя краіны маюць патрэбу ў сур'ёзнай палітычнай карэкцыі, і выкарыстоўваў для гэтага ваенную сілу, гэтыя краіны ператвараюцца ў крыніцу хаосу і тэрарызму як для сваіх суседзяў, так і для ўсяго свету. Дастаткова паглядзець, што адбываецца цяпер у Іраку і Афганістане, Егіпце і Лівіі. І расійскія, і кітайскія палітыкі ўпэўнены, што Захад сапраўды не ўмее нічога ўрэгуляваць у тых краінах, лёсам якіх зацікавіўся. Ён проста спрабуе зляпіць на хуткую руку нейкія «дэмакратычныя» структуры кіравання, якія на самой справе недзеяздольныя, не карыстаюцца аўтарытэтам ва ўласнага народа, не здольны эфектыўна змагацца з тэрарыстамі і радыкаламі, далёкія ад эфектыўнасці ў мадэрнізацыі эканомікі, залежаць ад заходніх цэнтраў прыняцця палітычных рашэнняў і ствараюць у выніку сваёй дзейнасці значна больш праблем і для Расіі, і для Кітая, чым былыя палітычныя рэжымы.

Між тым і існуючых сусветных праблем цалкам дастаткова, без тых, што ствараюць у выніку сваёй ліхаманкавай, але не прадуманай актыўнасці заходнія краіны. У гэтым плане паказальнае выступленне міністра замежных спраў Расіі Сяргея Лаўрова на пачатку снежня на асамблеі Савета па знешняй і абароннай палітыцы. Ён адзначыў: «Навязванне іншым уласнай палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сістэмы ў большасці выпадкаў выклікае адваротную рэакцыю і можа садзейнічаць узмацненню экстрэмісцкіх і рэпрэсіўных сіл, адсоўваючы перспектыву сапраўды дэмакратычных перамен». На думку міністра, небяспека такога «гвалтоўнага насаджэння дэмакратыі заключаецца ў тым, што яно вядзе да ўзмацнення хаосу і можа абярнуцца крызісам кіраванасці на глабальным узроўні».

Акрамя таго, важным аргументам на карысць таго, што ў Турцыі Пуціным не магло быць прынята прынцыпова новага рашэння па адмаўленні ад былой пазіцыі, з'яўляецца статус Турцыі ў сучасным свеце. Турцыя вельмі добра развівала сваю эканоміку ў апошнія гады, але яе прэстыж на сусветнай арэне яшчэ дастаткова невялікі. Памер турэцкай эканомікі складае толькі трэць ад расійскай, краіна не валодае ядзернай зброяй, не з'яўляецца, як Расія, пастаянным членам Савета Бяспекі ААН, валодае даволі сціплай па памеры тэрыторыяй і з'яўляецца адным з некалькіх канкурыруючых лідараў у сваім рэгіёне.

Тыя эканамічныя, фінансавыя і інвестыцыйныя пагадненні, якія былі заключаны ў Турцыі па супрацоўніцтве з Расіяй, дазваляюць ёй палепшыць свае эканамічныя перспектывы за кошт выкарыстання расійскіх нетраў, расійскіх інвестыцый і расійскіх тэхналогій, і больш неабходныя Турцыі, чым Расіі. Тое ж датычыцца і галіны знешняга гандлю: Анкара, якая зрабіла стаўку на рост эканомікі за кошт экспарту тавараў прамысловай групы, значна больш зацікаўлена ў збыце сваіх тавараў у Расію, чым Масква, якая збывае за мяжу перш за ўсё сыравіну (якая і так запатрабавана як у Турцыі, так і па ўсім свеце), зацікаўлена ў турэцкім рынку.

Што датычыцца далучэння Турцыі да еўразійскай інтэграцыі ў тым фармаце, пры якім лідзіруе Расія, то і тут ёсць сур'ёзныя праблемы — Турцыя сама ў 1990-х пачала прапагандаваць палітычныя працэсы па еўразійскай інтэграцыі ў постсавецкай прасторы пад сваім лідарствам і наўрад ці збіраецца саступаць пальму першынства.

Адмаўленне або згода Расіі галасаваць па варыянтах рэзалюцый па Сірыі, падрыхтаваных заходнімі краінамі, з'яўляецца геапалітычным козырам вышэйшага ўзроўню і сур'ёзна абмяркоўваецца Расіяй толькі з геапалітычнымі гульцамі вышэйшай лігі, на ўзровень якой Турцыя пакуль не выйшла. Іншымі словамі, калі б Пуцін хацеў кардынальна змяніць пазіцыю Расіі па сірыйскім пытанні, перайшоўшы на пазіцыю Захаду, ён абмяркоўваў бы тыя бонусы, якія ў адказ павінна атрымаць Расія, з тымі геапалітычнымі акцёрамі, якія здольны гэтыя бонусы даць — Вашынгтонам, Бруселем або Берлінам.

Што датычыцца інфармацыі, апублікаванай у турэцкіх газетах, то яе дакладнасць выглядае сумніўна. Безумоўна, візіт лідара такога высокага рангу, як Уладзімір Пуцін, для перамоў выклікаў ажыятаж у СМІ, што непазбежна прывяло да выказвання мясцовымі журналістамі і аналітыкамі розных здагадак і перабольшання ролі Турцыі як магутнага геапалітычнага гульца ў свеце, паколькі турэцкія грамадзяне настроены вельмі патрыятычна. Калі тэмпы развіцця турэцкай эканомікі будуць ранейшымі, аднойчы яна сапраўды ўвойдзе ў вышэйшую лігу сусветнай геапалітыкі, і тады ў Анкары будуць вырашацца сапраўды сур'ёзныя сусветныя праблемы. Але пакуль гэта не так.

**Сяргей КІЗІМА, загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.**



**ЗУСІМ па-іншаму загучала «сірыйскае пытанне» пасля афіцыйнага візіту прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна ў Турцыю на пачатку снежня. Нагадаем, што гэты візіт быў запланаваны на 14-15 кастрычніка, але потым быў перанесены на іншую дату нібыта з-за напружанага графіка Пуціна і арганізацыйных перашкод для візіту, якія раптам паўсталі. Тым не менш адмена візіту адбывалася на фоне расійска-турэцкага «самалётнага» крызісу.**

Але пасля заявы міністра замежных спраў Турцыі Ахмета Давутаглу, які адзначыў, што гэтыя падзеі не здольны абвастрыць адносіны Турцыі і Расіі, «самалётны крызіс» быў вычарпаны.

Некаторыя турэцкія аналітыкі тады сцвярджалі, што адмена візіту была абумоўлена не «самалётным крызісам», а тым, што пакуль не былі вядомы вынікі прэзідэнцкіх выбараў у ЗША і ў сувязі з імі новы «картачны расклад» вакол сітуацыі ў Сірыі і ў свеце.

Зараз сітуацыя праяснілася. Нягледзячы на тое, што асноўная частка парадка дня трэцяга расійска-турэцкага пасяджэння Савета супрацоўніцтва вышэйшага ўзроўню, для ўдзела ў якім у Стамбул прыбыў Уладзімір Пуцін, складала абмеркаванне сумесных праектаў у гандлёвай, энергетычнай і інвестыцыйнай сферах, увагай не абышлі і сітуацыю вакол сірыйскага крызісу.

Да гэтага моманту Масква і Анкара знаходзіліся на супрацьлеглых полюсах па поглядах на шляхі вырашэння сірыйскага крызісу, які стаў пытаннем нумар адзін знешнепалітычнага парадку дня для Турцыі.

Але пасля візіту Уладзіміра Пуціна ў Стамбул турэцкія аналітыкі пачалі гаварыць пра новы расійска-турэцкі план вырашэння сірыйскага крызісу — «Сірыя без Асада». Падставай для такіх меркаванняў служыць кардынальная змена рыторыкі расійскага боку адносна развіцця сітуацыі ў Сірыі. У сувязі з гэтым знакавай стала заява Уладзіміра Пуціна, якую ён зрабіў падчас візіту ў Стамбул пра тое, што Расія не з'яўляецца адвакатам рэжыму Асада, але занепакоена будучыняй Сірыі. На сумеснай прэс-канферэнцыі з прэм'ер-міністрам Турцыі Рэджэпам Таіпам Эрдаганам Уладзімір Пуцін заявіў: «Наконт ацэнкі таго, што адбываецца ў Сірыі. Пазіцыі нашы супадаюць не толькі па гэтым пытанні (па гуманітарным), але і наконт таго, якой сітуацыі мы павінны дасягнуць у Сірыі. Пакуль не можам знайсці агульных падыходаў па метадах дасягнення мэт». Паводле яго слоў, міністрам замежных спраў дзвюх краін, Сяргею Лаўрову і Ахмету Давутаглу, даручана правесці дадатковыя кансультацыі па Сірыі, паколькі ўзніклі «новыя ідэі па ўрэгуляванні сітуацыі».

Згодна з крыніцамі выданняў Hurriyet і Milliyet у межах «новых ідэй па ўрэгуляванні сітуацыі» ў Сірыі прадугледжваецца стварэнне рабочых груп, якія павінны правесці перамовы з прадстаўнікамі супрацьлеглых сірыйскіх бакоў і выпрацаваць формулу «пераходнага працэсу» на аснове патрабаванняў сірыйскага народа, але без удзелу ў ім цяперашняга прэзідэнта Башара Асада.

Ізноў жа, згодна з крыніцамі Hurriyet, падчас перамоў расійскага і турэцкага лідараў, а таксама міністраў замежных спраў дзвюх дзяржаў, сярод іншага абмяркоўвалася пытанне і аб выдзяленні Башару Асаду і членам яго сям'і «прытулку» на аддаленай ад рэгіёна тэрыторыі. Пры гэтым падкрэсліваецца, што на пытанне турэцкага боку аб магчымасці прыняцця Асада ў Расіі кіраўніцтва Масквы адрэагавала негатыўна.

Іншым такім «сігналам» з'яўляецца дамоўленасць аб правядзенні ў рамках саміту АБСЕ ў Дубліне 6-7 снежня трохбаковай сустрэчы міністра замежных спраў РФ Сяргея Лаўрова, Дзяржсакратара ЗША Хілары Клінтан і спецпасланніка ААН і Лігі арабскіх дзяржаў Лахдара Браха з мэтай абмеркавання сірыйскага крызісу. Турэцкія выданні Olay gazete, Zaman і Star інтэрпрэтуюць удзел Сяргея Лаўрова ў перамовах як згоду Масквы на выдаленне ад улады Башара Асада.

Цікава, што менавіта пасля аканчэння візіту Пуціна ў Турцыю Савет міністраў замежных спраў НАТА прыняў рашэнне аб адпраўцы ў Турцыю сістэм СПА Patriot для прадухілення авіяўдараў з боку Сірыі. Вядома, што пытанне размяшчэння натаўскіх комплексаў Patriot у Турцыі выклікала занепакоенасць афіцыйнай Масквы і, згодна з пазіцыяй Крамля, не спрыяе стабілізацыі і без таго хісткай сітуацыі ў рэгіёне. Гэтае пытанне павінна было абмяркоўвацца падчас перамоў Уладзіміра Пуціна ў вузкім складзе з прэм'ерам Рэджэпам Эрдаганам.

Адразу пасля гэтага, 7 снежня, прагучала заява міністра абароны ЗША Леона Панеты, які паведаміў, што існуючыя разведданыя наводзяць на думку, што сірыйскае кіраўніцтва разглядае магчымасць выкарыстання хімічнай зброі супраць паўстанцаў. Падкрэслім, што такі ж самы аргумент з'яўляўся адным з ключавых пры падрыхтоўцы ваеннай аперацыі міжнароднай кааліцыі супраць Лівіі.

А 9 снежня міністр замежных спраў РФ Сяргей Лаўроў пацвердзіў, што Масква не вядзе ніякіх перамоў пра лёс прэзідэнта Сірыі Башара Асада. Такім чынам, як мінімум збыўся адзін прагноз турэцкіх аналітыкаў.

Калі прааналізаваць вынікі візіту Пуціна ў гандлёвай, энергетычнай і інвестыцыйнай сферах, то можна зрабіць выснову, што ўсе супярэчнасці паміж Турцыяй і Расіяй па «сірыйскім пытанні» зняты.

І гэта вельмі лагічна на фоне нарошчвання стратэгічнага партнёрства паміж Турцыяй і Расіяй. Каля 60% газу Турцыя набывае ў Расіі. Будаўніцтва першай турэцкай АЭС у Акую, кошт якой ацэньваецца ў $20 млрд, ажыццявіць расійская кампанія «Расатам». Чакаецца, што аб'ём двухбаковага гандлю, які да канца года дасягне каля $35 млрд, згодна з заявай Рэджэпа Эрдагана, на працягу некалькіх гадоў складзе $100 млрд.

Сам неаднойчы быў сведкам цікавых меркаванняў турэцкіх экспертаў, згодна з якімі зняцце супярэчнасцяў паміж Турцыяй і Расіяй па «сірыйскім пытанні» выведзе двухбаковыя адносіны на якасна новы стратэгічны ўзровень, што, у тым ліку, падштурхне Турцыю прыняць удзел у еўразійскіх інтэграцыйных працэсах разам з Расіяй.

Звяртаючыся да сітуацыі ў Сірыі, ўжо зараз можна заўважыць некаторыя аналогіі з «лівійскім сцэнарыем». Сірыйскія паўстанцы прызнаны ў якасці легітымнага прадстаўніка сірыйскага народа Турцыяй, Францыяй і Велікабрытаніяй, маюць фінансавую і ваенна-тэхнічную падтрымку з боку часткі міжнароднай супольнасці. Размяшчэнне натаўскіх комплексаў Patriot на турэцка-сірыйскай мяжы — першы крок да стварэння беспалётнай зоны над тэрыторыяй Сірыі. Пытанне прадастаўлення прытулку Асаду і яго набліжаным знята. Заходнімі краінамі агучана пагроза выкарыстання сірыйскім кіраўніцтвам хімічнай зброі супраць «сірыйскай апазіцыі». Засталося галасаванне па рэзалюцыі ў Савеце Бяспекі ААН наконт міжнароднай інтэрвенцыі ў Сірыю. І верагоднасць таго, што Расія накладзе вета на гэтую рэзалюцыю, вельмі малая, а можа, і зусім адсутнічае...

**Арсеній СІВІЦКІ, палітычны аналітык**

■

■ Стыхія

# ПРЫБРАЦЬ СНЕГ ПЕРАШКАДЖАЕ... СНЕГ

**НЕКАЛЬКІ дзён снегападаў у Мінску не прайшлі дарма для яго жыхароў. Дабрацца на працу, не памясіўшы нагамі снежную «кашу» на тратуарах, — справа нечуваная. А некаторыя ўмудраюцца і пакаўзнуцца, і загразнуць, едучы на машыне. Спраўляцца з такой вялікай колькасцю асадкаў супрацоўнікам камунальных службаў каштуе вялікіх намаганняў.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Адначасова прыбраць усю гарадскую тэрыторыю проста немагчыма, калі снег ідзе ледзь не штодзень, — паведаміў журналістам **генеральны дырэктар дзяржаўнага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Уладзімір ХАДАРЦЭВІЧ** падчас прэс-канфэрэнцыі ў Мінгарвыканкаме.

Каб забяспечыць гараджанам расчышчаны ад снегу шлях, працу сваю дворнікі зараз пачынаюць не ў 7, а ў 6 гадзін раніцы. Сёння рабочых па комплекснай уборцы ў Мінску — 5,5 тысячы чалавек. Акрамя таго, прыцягваюцца да ўборкі снегу дадатковыя сілы — каля 2 тысяч рабочых іншых спецыяльнасцяў. Працуюць 280 адзінак тэхнікі. Тым не менш, цалкам вырашыць праблемы, якія «прынёс» у горад снегапад, пакуль не атрымліваецца.

— Большая частка рабочых па комплекснай уборцы ў нашым штаце (а гэта 76%) — жанчыны. Ім даводзіцца цягаць увесь той снег, які замятае двары, — зазначыла **намеснік генеральнага дырэктара аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Галіна ГІЛЕВІЧ.** — 27% ад гэтай колькасці — жанчыны-пенсіянеркі. Снег, прыбраны з двароў і вуліц, традыцыйна звозіцца ў пэўныя месцы.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

# БЯЗДОМНЫЯ ТАКСАМА БУДУЦЬ ЗАНЯТЫ НА АЧЫСТЦЫ ВУЛІЦ

**АСОБ без пэўнага месца жыхарства будуць прыцягваць да работ па ўборцы снегу ў дапамогу дворнікам з жыллёвых службаў. Пра гэта паведаміў Уладзімір Хадарцэвіч, генеральны дырэктар Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі.**

За дапамогу ва ўборцы такіх грамадзян будуць карміць абедам і даваць гарачы чай. Асоб без пэўнага месца жыхарства плануецца задзейнічаць на расчыстцы дарожак паміж жылымі дамамі і прыпыначнымі пунктамі, а таксама ў месцах, аддаленых ад дзіцячых пляцовак. Падобнае практыкавалася ў час суботнікаў па ўборцы лісця. Тады да работ удалося прыцягнуць каля 30 бяздомных у кожным адміністрацыйным раёне сталіцы.

*«Мінск-Навіны»*

■

УНП 101541722

**Открытое акционерное общество**
**«Белорусская валютно-фондовая биржа»**
сообщает, что Общим собранием акционеров данного общества, состоявшимся 28.11.2012,
**принято решение о распределении прибыли, полученной по результатам работы за 9 месяцев 2012 года, и выплате дивидендов из расчета 265 белорусских рублей на 1 акцию.**
Список акционеров, имеющих право на получение дивидендов, составлен в соответствии с реестром акционеров ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» по состоянию на 26.10.2012.

По вопросам выплаты дивидендов обращаться по адресу: **220013, г. Минск, ул. Сурганова, 48а,** контактный телефон **209 41 04.**

Утерянные представительством Белгосстраха по Центральному району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ №№ 0246808, 0037168, по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВС №№ 5667037, 5667038, по обязательному медицинскому страхованию иностранных граждан и лиц без гражданства, временно пребывающих или временно проживающих в Республике Беларусь формы 2РН серии БВ № 2701333, квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1СУ серии КС №№ 1264078, 1264079 **считать недействительными.**

УНП 101883943

**ЧСТУП «ЦЕМЕКС» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА:**

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена лота, без НДС, руб. | Задаток 10%, без НДС, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | Автомобиль MITSUBISHI AUTLENDER, 2007 г.в. | 198 651 600 | 19 865 160 |
| 2 | Емкость металлическая 60 м.куб | 14 149 000 | 1 414 900 |
| 3 | Емкость металлическая 60 м.куб | 14 149 000 | 1 414 900 |

**Организатор торгов –** ликвидатор ЧСТУП «Цемекс» ЧУП «Юриспрудент».

**Продавец –** ЧСТУП «Цемекс».

С имуществом можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 9.00 до 17.00: г. Гомель, ул. Барыкина, 309Б.

Задаток перечисляется до 21.12.2012 г. (включительно), на р/с 3012208440011, филиал ОАО «Белагропромбанк», ГОУ г. Гомель, код 912, УНН 490000841.

**Условия продажи –** без условий.

Шаг аукциона в размере 5% от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течении 7 рабочих дней после подписания протокола и возместить затраты на проведение торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление с приложением: для юридических лиц – заверенные копии свидетельства о гос. регистрации, устав; для индивидуального предпринимателя – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копия паспорта.

**Срок подачи заявления с момента выхода настоящего объявления до 10.00 21.12.2012 года по адресу:** г. Гомель, ул. Молодости, 5, ком. 3.

**Дата, время, место проведения открытого аукциона** 22.12.2012 года в 10.00, г. Гомель, ул. Молодости, 5, ком. 3.

**По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества обращаться по телефонам: (8029) 698 07 48, (80232) 68 38 84.**

# У ЕЎРОПУ — У ПАРЫ

**Полацкія пагранічнікі недалёка ад беларуска-латвійскай мяжы затрымалі ўраджэнца Каўказа і 28-гадовую мінчанку.**

У мужчыны пры сабе не было ніякіх дакументаў. Затрыманы растлумачыў, што ён у Мінск прыехаў на цягніку, дзе і пазнаёміўся са сваёй спадарожніцай. І прама на вакзале «парачка» прыняла рашэнне рызыкнуць і пашукаць лепшага жыцця ў Еўрасаюзе. Як высветлілася, месяц назад мужчына ўжо прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за аналагічнае правапарушэнне.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ, НАХОДЯЩИХСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ**

**Аукцион состоится 15 января 2013 г. в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.**

**Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел. 8(0222)229022, 311185, 223375.**

**Продавцы недвижимого имущества: по лоту № 1 – республиканское унитарное предприятие «Могилевский завод лифтового машиностроения», тел. 8(0222)262446; по лотам №№ 2 и 3 – республиканское производственное унитарное предприятие «Дорводоканал», тел. 8(0222)393561.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00 в фонде «Могилевоблимущество» по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104, начиная со дня публикации извещения. Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **11 января 2013 г. с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00.** Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

Заключительная регистрация участников аукциона в фонде «Могилевоблимущество» **15 января 2013 г. с 10.00 до 10.50.**

| № лота | Сведения о предметах аукциона | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Информация о недвижимом имуществе | | | Информация о земельном участке | | | | |
| | Наименование и краткая характеристика | Место нахождения | Начальная цена недвижимого имущества, тыс. руб. | Площадь, га | Срок аренды, лет | Начальная цена права заключения договора аренды земельного участка, тыс. руб. | Начальная цена предмета аукциона, тыс. руб. | Сумма задатка, тыс. руб. |
| 1 | Незавершенное законсервированное капитальное строение одноэтажное, стены панельные, кирпичные площадью 7 355,5 кв.м | г. Могилев, Славгородское шоссе | 1 101 672,0 | 2,4896 | 50 | 360 187,587 | 1 461 859,587 | 290 000,0 |
| 2 | Водонапорная башня одноэтажная кирпичная, 34,8 кв.м | Могилевская обл., г. Быхов, ст. Быхов | 4 881,883 | 0,0141 | 10 | - | 4 881,883 | 970,0 |
| 3 | Здание насосной станции с пристройкой одноэтажное, кирпичное, 95,8 кв.м | Могилевская обл., г. Быхов, ул. Вильня | 5 580,619 | 0,1598 | 10 | - | 5 580,619 | 1 100,0 |

Начальная цена недвижимого имущества понижена: по лоту № 1 – на 50 процентов; по лотам №№ 2, 3 – на 80 процентов.

Условия для победителя аукциона (единственного участника) по лоту № 1 в отношении земельного участка, входящего в состав лота, – в двухмесячный срок со дня государственной регистрации договора аренды земельного участка получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия на инженерно-техническое обеспечение объекта строительства (в случае изменения назначения приобретенного на аукционе объекта недвижимости).

Земельные участки предоставляются победителям (единственным участникам) аукциона по лотам №№ 2 и 3 в аренду без взимания платы за право заключения договора аренды.

Задаток перечисляется до момента подачи заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Аукцион является открытым, его участниками могут быть граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительства за границей, и лица без гражданства).

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается **заявление** на участие в аукционе с приложением следующих документов:

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия в установленном порядке из Устава либо иного учредительного документа.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, перечисленные выше, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Допускается участие в аукционе на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более субъектов малого предпринимательства – индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций (далее – консолидированные участники).

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы:

оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе;

сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов от консолидированных участников уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление на участие в нем. Неявка участника аукциона на аукцион приравнивается к письменному отзыву заявления на участие в нем.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до его проведения, при этом объявление об отказе от проведения аукциона публикуется в газете «Звязда».

Победители (единственные участники) аукциона по лотам №№ 2 и 3 в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона (утверждения протокола), а по лоту № 1 в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка обязаны внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (только по лоту №1), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков, на счета получателей, указанные в протоколе аукциона.

Срок заключения договора купли-продажи недвижимого имущества и договора аренды земельного участка – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат. При уклонении одной из сторон от заключения договора купли-продажи недвижимого имущества или договора аренды земельного участка другая сторона вправе обратиться в суд с требованием о понуждении заключить договор, а также о возмещении убытков, причиненных уклонением от его заключения. Договор аренды земельного участка и возникновение основанного на нем права аренды подлежат государственной регистрации в соответствии с законодательством.

Оплата за недвижимое имущество осуществляется денежными средствами по безналичному расчету в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи имущества.

Информация об объектах, предлагаемых к продаже, размещена на сайтах Могилевского областного исполнительного комитета **region.mogilev.by** и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by**.

Краіна здароўя

Выпуск № 7 (301)

■ Доктар адкажа

# ВОЧНЫ КОМПЛЕКС ДЛЯ ПАЖЫЛЫХ І НЕ ТОЛЬКІ

*«Якія карысныя практыкаванні для вачэй трэба выконваць? Ці сапраўды варта чакаць ад іх пэўнага эфекту?*

**Людміла Сямёнаўна,** *Уздзенскі раён»*

**Урач-гігіеніст аддзела грамадскага здароўя Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Алена ВОЛАХ:**

— З узростам вочы старэюць, як і любы іншы орган. Больш за тое, наш арганізм — цэласная сістэма, у якой усё ўзаемазвязана. Так, пры цукровым дыябеце з'яўляюцца цяжкія ўскладненні з боку вачэй, пры парушэннях абмену рэчываў можа ўзнікаць памутненне хрусталіка — катаракта. Захворванні сардэчна-сасудзістай сістэмы адбіваюцца на забеспячэнні крывёй сятчаткі і зрокавага нерва. Хваробы нервовай, сасудзістай і эндакрыннай сістэм могуць прывесці да ўзнікнення глаўкомы. Парушэнні зроку разам з артрозам, гіпертаніяй могуць прывесці да падзення і пераломаў.

Папярэдзіць парушэнне зроку, запаволіць яго пагаршэнне дапамогуць простыя правілы.

1. Рэгулярна праходзьце агляд у афтальмолага з вымярэннем унутрывочнага ціску. Калі ўрач рэкамендуе насіць акуляры пастаянна, значыць, трэба трымацца гэтай рэкамендацыі, нават калі гэта розныя акуляры: для чытання і для прагулкі на свежым паветры. Акуляры павінны быць правільна падабраныя і якасна выраблены. Чужымі карыстацца нельга. Ніколі не набывайце акуляры ў падземным пераходзе! Сачыце за тым, каб лінзы былі чыстымі, непашкоджанымі. Асабліва лёгка пашкоджваюцца пластыкавыя лінзы. Калі яны падрапаліся, акуляры трэба замяніць.

2. Беражыце вочы ад ультрафіялету. У яркі сонечны дзень неабходны сонцаахоўныя акуляры. Чытаць у сонечны дзень трэба ў цёмных акулярах або ў цені. Аднак у пахмурны дзень і ў памяшканнях насіць цёмныя акуляры нельга. Гэта шкодзіць зроку.

3. Кантралюйце ўзровень глюкозы ў крыві. Цукровы дыябет— адна з прычын, якая прыводзіць да парушэння зроку.

4. Не эканомце на электраэнергіі, калі чытаеце, пішаце, малюеце, вяжаце і г.д. Уключайце не толькі верхняе святло, але і настольны свяцільнік, бра, таршэр. Блізарукім і пажылым людзям неабходна лямпачка ў 75-100 Вт. Карыстацца «голымі», не абароненымі абажурам лямпачкамі не варта.

5. Камп'ютар павінен быць укамплектаваны добрым маніторам, выкарыстоўвайце якасныя праграмы.

6. Харчаванне неабходна збалансаваць з улікам карысці для зроку. Для вачэй важнае значэнне маюць вітаміны С, Е, селен (абараняюць вочы ад свабодных радыкалаў, якія актыўна ўтвараюцца пад уздзеяннем ультрафіялетавых промняў), цынк (дапамагае стабілізаваць абарончы пігмент клятчаткі вока). **А самыя актыўныя складнікі ахоўнай сістэмы вачэй — лютэін і зеаксанцін. Гэтыя два караціноіды, нібы фільтр, затрымліваюць да 60 працэнтаў ультрафіялету, які пашкоджвае сятчатку, нейтралізуюць свабодныя радыкалы. Названыя рэчывы часам называюць нават «прыроднымі сонечнымі акулярамі». Асабліва важна гэта для людзей ва ўзросце пасля 40 гадоў, паколькі з цягам часу натуральная абарона вачэй аслабляецца. Важныя рэчывы не сінтэзуюцца ў арганізме, і аднавіць іх запас можна толькі з прадуктамі харчавання — такімі, як шпінат, брокалі, гарох, лісцевая і брусельская капуста, яечны жаўток, кукуруза і морква.** Аднак для аднаўлення сутачнай патрэбы ў лютэіне і зеаксанціне неабходна з'ядаць 1,5 кг свежай морквы, а гэта малаверагодна. З гэтай прычыны рэкамендуецца ўжываць спецыяльныя вітамінна-мінеральныя комплексы.

7. Рабіце гімнастыку для вачэй. Найбольшую карысць такія практыкаванні прыносяць на першых стадыях аслаблення зроку. **«Вочны» комплекс пажадана выконваць не толькі пажылым, але і тым, хто працуе за камп'ютарам, — заўсёды, калі вочы стамляюцца.** Выконваць практыкаванні неабходна спакойна і раўнамерна. Нельга іх выконваць пры адслаенні сятчаткі, а пры наяўнасці іншых хвароб рэкамендуецца пракансультавацца ў афтальмолага.

Практыкаванні можна выконваць 1-2 разы на дзень — раніцай і ўвечары. Першыя 3 дні кожнае практыкаванне выконваецца па 2 разы, далей колькасць паўтораў неабходна павялічыць да 12. Праз 2 месяцы можна выконваць кожнае практыкаванне 2 разы па 12 паўтораў. У перапынках паміж практыкаваннямі па 10-15 секундаў выконвайце пальмінг (штучнае зацямненне вачэй далонямі, якія павінны быць цёплымі і не цісnuць на вочы). Гэта максімальна расслабляе мышцы вачэй.

**ПРАКТЫКАВАННЕ 1.**

Перавесці позірк па гарызанталі ўлева да ўпору, затрымаць на 2 секунды, перавесці позірк управа да ўпору, затрымаць на 2 секунды, вярнуць вочы ў зыходнае становішча. Паўтарыць цыкл патрэбную колькасць разоў.

**ПРАКТЫКАВАННЕ 2.**

Перавесці позірк вертыкальна ўгору да ўпору, затрымаць на 2 секунды, перавесці вертыкальна ўніз да ўпору, затрымаць на 2 секунды. Вярнуць вочы ў зыходнае становішча. Паўтарыць.

**ПРАКТЫКАВАННЕ 3.**

Перавесці позірк па дыяганалі ўлева-ўгору да ўпору, затрымаць на 2 секунды, перавесці позірк па дыяганалі ўправа-ўніз на 2 секунды.

**ПРАКТЫКАВАННЕ 4.**

Перавесці позірк па дыяганалі ўправа-ўгору да ўпору — на 2 секунды, перавесці позірк па дыяганалі ўлева-уніз да ўпору — на 2 секунды.

**ПРАКТЫКАВАННЕ 5.**

Звесці вочы ўгору і да носа — так, каб бачыць пераноссе, — на 2 секунды, перавесці вочы ўніз, зводзячы іх да носа, каб бачыць яго кончык — на 2 секунды.

**ПРАКТЫКАВАННЕ 6.**

Выпісваць вачыма ромбы злева направа. Перавесці позірк па гарызанталі ўлева да ўпору на 2 секунды, перавесці вочы да цэнтру і ўгору да ўпору на 2 секунды, перавесці позірк управа да ўпору на 2 секунды, перавесці позірк да цэнтра і ўніз да ўпору на 2 секунды. Вярнуць вочы ў зыходнае становішча. Ромб можна «маляваць» і справа налева.

**ПРАКТЫКАВАННЕ 7.**

Аналагічнае практыкаванню 6, але, замест таго, каб паднімацца да цэнтра і ўгору, вочы факусіруюцца на пераноссі, а замест таго, каб апускацца да цэнтра і ўніз, фіксуюцца на кончыку носа.

**ПРАКТЫКАВАННЕ 8.**

Перавесці позірк па гарызанталі ўлева да ўпору, далей павольна і раўнамерна апісваць вачыма кругі, пачынаючы рух управа і ўгору. Паўтараць кругавыя рухі патрэбную колькасць разоў. Або тое ж самае, але ў супрацьлеглы бок, пачынаючы з руху ўправа і ўніз.

**ПРАКТЫКАВАННЕ 9.**

Перавесці позірк па дыяганалі ўлева-ўгору да ўпору, затрымаць на 2 секунды, перавесці позірк вертыкальна ўніз на 2 секунды, перавесці позірк па дыяганалі ўправа-гору, вертыкальна ўніз, вярнуць вочы ў зыходнае становішча. Рух ажыццяўляецца па траекторыі, якая ўяўляе сабой два трохвугольнікі з агульнай вяршынай, размешчанай паміж унутранымі куткамі вачэй.

**ПРАКТЫКАВАННЕ 10.**

Вачыма трэба апісваць васьмёркі. Вочы водзяцца ўніз да кончыку носа, далей рухаюцца ўлева ўніз, апісваючы круг максімальнага дыяметру па стрэлцы гадзінніка да таго часу, пакуль не сыдуцца на пераноссі. Праз зыходнае становішча рух працягваецца ўправа і ўніз, далей апісваецца круг максімальнага дыяметру супраць гадзіннікавай стрэлкі, вочы зноў зводзяцца на пераноссі, пераходзяць у зыходнае становішча, з якога цыкл пачынаецца зноў. Рух павінен быць павольным.



**ПРАКТЫКАВАННЕ 11.**

Размясціць указальны палец перад вачыма на адлегласці выцягнутай рукі. Павольна набліжаць яго да пераносся, пастаянна фіксуючы позірк на яго кончыку, затым без адрыву позірку ад кончыка пальца павольна перавесці вочы ў зыходнае становішча.

**ПРАКТЫКАВАННЕ 12.**

Пераводзіць позірк з блізкага прадмета на далёкі і назад. Можна прымацаваць на аконнае шкло чорны кружок так, каб ён знаходзіўся на ўзроўні вачэй на адлегласці 25 см, і пераводзіць позірк з кружка на нейкі аб'ект, размешчаны ўдалечыні, і назад, дабіваючыся таго, каб можна было больш ясна бачыць і блізкі, і далёкі аб'ект. Больш зручна трымаць перад вачыма (на адлегласці 25 см) які-небудзь прадмет, напрыклад, ручку, і пераводзіць позірк з яе кончыка на аб'ект, размешчаны ўдалечыні. Напачатку практыкаванне выконваецца 3 хвіліны. Праз кожныя 3 дні трэба дадаваць па хвіліне і давесці яго выкананне да 10 хвілін.

**ПРАКТЫКАВАННЕ 13.**

Моцна заплюшчыце вочы на 3-5 секундаў, потым адкрыйце вочы на 3-5 секундаў. Паўтарыце патрэбную колькасць разоў.

**ПРАКТЫКАВАННЕ 14.**

Хутка міргайце 10-15 секундаў. Паўтарайце 3-6 разоў, праз 10-15 секундаў. Гэта карысна рабіць на працягу дня — паміргаць і расслабіць вочы.

**ПРАКТЫКАВАННЕ 15.**

Самамасаж. Патрыце кісці адна аб адну, каб падушачкі пальцаў былі цёплымі. Заплюшчыце вочы, расслабцеся, падушачкамі мякка правядзіце 15-20 разоў уздоўж верхняга павека ад вонкавага краю вока да ўнутранага, затым — уздоўж ніжняга павека. Мякка пастукваючы падушачкамі ўказальнага і сярэдняга пальцаў, 15-20 разоў прайдзіцеся ўздоўж верхняга павека і столькі ж уздоўж ніжняга павека ад знешняга краю да ўнутранага. Адчуванні павінны быць пры гэтым прыемнымі ■

■ Інфарм-укол

## З-ЗА ЧАГО Ў ДЗЯЦЕЙ НЕ ПРАЦУЕ КІШЭЧНІК?

**ЛЮБАЯ змена ў харчаванні можа прывесці да дысфункцыі кішэчніка, адной з праяў якой з'яўляецца запор.**



Паводле слоў **медсястры 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Ірыны ШАЎЦОВАЙ**, парушэнні нармальнай кішэчнай флоры адбываюцца па розных прычынах. Любыя праблемы ў жанчыны падчас цяжарнасці — пагроза выкідышу, таксікоз, інфекцыйныя хваробы, прыём антыбіётыкаў або гарманальных прэпаратаў, схаваныя захворванні могуць стаць прычынай дысбактэрыёзу ў дзіцяці.

Пажадана, каб малое хоць бы да 6 месяцаў кармілася грудным малаком, не пажадана ўвядзенне прыкорму да гэтага часу. Звычайна ў дзяцей на штучным выкормліванні стул ў два разы радзей, чым у малых, якія атрымліваюць матуліна малако.

Вельмі важнымі тут будуць яшчэ некалькі момантаў:

— працяглае ўжыванне механічна і тэрмічна апрацаванай ежы (працёртыя стравы, пюрэ, кісель, кашы-размазні). Адсутнасць у рацыёне прадуктаў з грубай клятчаткай або харчовымі валокнамі. Ужыванне каларыйнай і малааб'ёмнай ежы (ікра, шакалад, мучныя вырабы, моцны чай або кава, какава, тварог, рыс, гранат, груша, айва);

— мышачная гіпатанія (слабасць) і гіпадынамія. У немаўлят мышачная слабасць можа развівацца на фоне недастатковай масы цела, рахіту, неўралагічных захворванняў;

— любы псіхаэмацыянальны стрэс — адаптацыя да дзіцячага садка, смерць блізкіх людзей або любімых жывёл, празмернае пакаранне за правіннасць, моцны спалох, канфлікты з равеснікамі і г.д.;

— у школьнікаў праблема можа з'явіцца з-за неабходнасці заглушаць падобныя позывы з-за таго, што сорамна, напрыклад, адпрасіцца з урока;

— бескантрольнае выкарыстанне некаторых лекаў (смекта, імодыум, антацыды, ферментатыўныя прэпараты);

— розныя захворванні. Эндакрынныя — цукровы дыябет, гіпатырэёз, псіхічныя і неўралагічныя — дэпрэсіі, рассеяны склероз, менінгіт. А таксама мукавісцыдоз, міястэнія, язвавая хвароба і інш.;

— нярэдка запор можа быць адзіным сімптомам, які ўказвае на наяўнасць глістоў.

Пры хранічным запоры з'яўляюцца кволасць, слабасць, зніжаецца апетыт, узмацняецца ўсмоктванне шкодных рэчываў. Можа развіцца запаленчы працэс у кішэчніку (каліт), павысіцца маторыка, што суправаджаецца болем у жываце, пашырыцца дыяметр кішкі, што прывядзе да яшчэ большага ўзмацнення запору.

Дыягназ хранічнага запору можа выстаўляцца пры наяўнасці дзвюх ці болей прыкмет на працягу 2 месяцаў: частата стулу становіцца радзей, чым 3 разы на тыдні, дэфекацыя патрабуе напружання, стул шчыльны, з'яўляецца адчуванне няпоўнага апаражнення.

Кансерватыўнае лячэнне ўключае дыетатэрапію, лекавую тэрапію, фізіятэрапію, лячэбную фізкультуру і масаж, механічнае апаражненне кішэчніка. Пры лячэнні гэтага стану бацькі павінны мець на ўвазе, што пастаянна звяртацца да клізмы нельга. Рабіць яе можна толькі ў выключных выпадках. Ні ў якім разе не выкарыстоўваць мыла.

Для прафілактыкі непрыемнасцяў неабходна:

❍ Як мага даўжэй захоўваць груднoe выкормліванне. Пры гэтым маці павінна, з аднаго боку, харчавацца разнастайна, паўнацэнна і збалансавана, а з другога — па магчымасці абмяжоўваць ужыванне высокаалергенных прадуктаў (яек, курынага мяса, рыбы, морапрадуктаў, грыбоў, мёду, цытрусавых).

❍ Не варта ўводзіць прыкорм раней за 6 месяцаў. Дзіцяці для нармальнага развіцця дастаткова тых рэчываў, якія ёсць у грудным малацэ або адаптаваных сумесях.

❍ Не трэба ўводзіць адначасова некалькі новых прадуктаў. Час адаптацыі — 7-10 дзён.

❍ Што да піцця, то трэба даваць столькі, колькі вып'е, насільна даваць піццё не варта. Можна даваць гатаваную ваду, дзіцячыя чаі, кропную ваду, з 4 месяцаў — слабаканцэнтраваныя адвары з чарнасліву, курагі, іншых сухафруктаў, ягадныя морсы (10 ягад на шклянку вады).

❍ Пасля ўвядзення ў рацыён цвёрдай ежы неабходна, каб дзіця атрымлівала гародніну, садавіну, ягады, крупы, непрацёртае мяса, арэхі, алей, кісламалочныя прадукты. Пажадана даваць сырыя садавіну і гародніну, салаты, вінегрэты, рассыпістыя кашы, супы з гародніны, кавалкі птушкі або іншага мяса.

❍ Забяспечце дзіцяці нармальную рухальную актыўнасць. Не карайце надта жорстка за правіннасці.

## РЫХТУЕМ МАЛОЕ ДА НАВЕДВАННЯ СТАМАТОЛАГА

**ПЕРШЫ візіт павінен быць азнаямляльна-прафілактычным. Ідэальна, калі першае наведванне стаматолага адбудзецца адразу пасля прарэзвання першых зубоў — паміж 6 і 12 месяцамі. Наступныя наведванні неабходна рабіць не менш за адзін раз на паўгода, калі доктар не парэкамендуе часцей.**

1. Не падкрэслівайце важнасць і выключнасць візіту. Будзьце спакойнымі самі. Размова ідзе пра звычайную справу. Калі вы дрыжачым голасам кажаце: не бойся, гэта зусім не балюча, то прымушаеце дзіця насцярожыцца.

2. Не кажыце, што ўрач нічога не будзе рабіць. Гэта не так, і дзіця пасля зразумее, што яго падманулі. Скажыце, што доктар паглядзіць і пачысціць зубы, вылечыць, калі яны баляць.

3. Можна парэпеціраваць наведванне ўрача. Раскажыце, што трэба ўвайсці ў кабінет, сесці ў крэсла, разявіць рот і трымаць яго адкрытым. Можна расказаць, што калі ўрач знойдзе ў зубе дзірачку, то яе трэба будзе закрыць спецыяльным пластылінчыкам. Перад гэтым жа зубкі трэба пачысціць спецыяльнай шчоткачкай, якая крышку гудзе, але ад гэтай шчоткачкі ўцякаюць усе жучкі і чарвячкі, якія жывуць у дзірачцы. Пасля таго, як урач пачысціць дзірачку, ён высушыць зуб са спецыяльнага «пісталеціка» і залепіць яе пластылінчыкам. Расказвайце спакойна, без лішніх складанасцяў. Можна таксама сказаць, што ідзяце да добрага доктара Айбаліта. Да яго ходзяць усе дзеткі, каб пайсці ад яго здаровымі і вясёлымі.

4. Лепей накіравацца да ўрача з раніцы, калі дзіця адпачыла і знаходзіцца ў добрым настроі.

5. Не раздражняйце ў гэты дзень дзіця па-пустому.

6. Можна загадзя падрыхтаваць падарунак маламу і незаўважна перадаць урачу, каб той уручыў яго пасля агляду і лячэння.

7. Пазбягайце пагроз і подкупу для заахвочвання на добрыя паводзіны.

8. Не імкніцеся ў самых малых дробязях апісваць усё, што будзе адбывацца.

Калі дзіця крыху старэйшае і разумее свае праблемы з зубамі, лепей дзейнічаць так:

❍ Раскажыце, чаму важна мець здаровыя зубы. Скажыце: «Не трэба баяцца ўрача. Ён дапамагае нам пазбавіцца непрыемнасцяў, дае парады, лечыць, клапоціцца пра нас».

❍ Калі вы мелі неасцярожнасць выказваць свае асцярогі перад візітам да стаматолага, прызнайце памылковасць сваёй пазіцыі: «Мне таксама было некалі страшна ісці, аднак усё заўсёды аказвалася добра — уважлівы ўрач, лячэнне без болю. Галоўнае — настроіць сябе станоўча».

❍ Словы «маленькі шчыпок», «сонная вада для зуба», «зубны казытун» лепей успрымаюцца дзіцем, чым рэальныя назвы.

❍ Пакажыце сваю гатоўнасць падтрымаць дзіця: «Сходзім разам, я буду побач».

❍ Ніколі не палохайце ўрачом, не рабіце з яго монстра.



### ДЗІЦЯ Ў КАБІНЕЦЕ СТАМАТОЛАГА

Не варта чакаць ад дзіцяці добрых паводзін. Аднак калі малое моцна хвалюецца, праяўляе агрэсіўнасць або празмерную плаксівасць, можа быць, варта перанесці візіт на іншы дзень. Папрасіце стаматолага паказаць крэсла, машыну і г.д., каб у наступны раз страх не быў такім моцным. Каб не перашкаджаць даверу паміж дзіцем і ўрачом, не варта ўмешвацца ў лячэнне.

### БАЦЬКІ Ў КАБІНЕЦЕ СТАМАТОЛАГА

Адны стаматолагі лічаць, што прысутнасць бацькоў у кабінеце падчас лячэння карысная. Іншыя думаюць, што гэта дрэнна. Звычайна да 3-4 гадоў прысутнасць мамы або таты пажаданая. Аднак пасля 4 гадоў дзеці, як правіла, лепш паводзяць сябе без бацькоў. **Узрост дзіцяці і яго папярэдні стаматалагічны вопыт — два моманты, якія дапамогуць урачу прыняць лепшае рашэнне адносна вашай прысутнасці ў кабінеце.**

Калі доктар і бацькі разам дапамагаюць дзіцяці, то першае наведванне, а надалей і лячэнне звычайна праходзяць паспяхова. Дзіця павінна набыць давер і ўпэўненасць, неабходныя для таго, каб стаць актыўным удзельнікам асабістай гігіены поласці рота і не баяцца стаматалагічнай дапамогі ■

■ Здаровае харчаванне

# ІКРА — ВЕЛЬМІ САЛЁНАЯ...

**ЗДАРОВАМУ харчаванню трэба вучыцца. Будзем рабіць гэта з дапамогай начальніка аддзела харчавання Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па харчаванні, доктара медыцынскіх навук Элеаноры КАПІТОНАВАЙ.**

### Якая ікра больш карысная: чырвоная або чорная?

Ікра рыб — далікатэсны прадукт і бывае на стале не кожны дзень і не ў кожнага беларуса. Чорную ікру нам забяспечваюць асятровыя пароды рыб, а чырвоную — ласасёвыя. Па сваёй харчовай і біялагічнай каштоўнасці ікра адносіцца да высокакаштоўных прадуктаў харчавання. І гэта зразумела, бо кожная ікрынка — гэта асобная яйцаклетка, з якой магла б нарадзіцца жывая рыбка. Таму яна змяшчае ўсе неабходныя для жыцця гэтай магчымай будучай рыбкі рэчывы: паўнацэнны бялок, высокакаштоўны тлушч, вітаміны і мінералы — увесь набор жыццёва важных інгрэдыентаў.

Па сваім біяхімічным саставе чорная і чырвоная ікра прыкладна аднолькавыя, але ў чорнай канцэнтрацыя карысных рэчываў вышэй, таму яе лічаць больш карыснай. Паколькі ікра — гэта вельмі спажыўны прадукт, то і яе каларыйнасць досыць высокая. Прыкладна 260-280 ккал. Для тых, хто трымаецца нізкакаларыйнай дыеты, ікру лепей ужываць не з маслам і булачкай, а ў палавінцы варанага бялку. Так будзе і смачна, і карысна, і калорый менш.

Трэба памятаць пры гэтым, што ікра змяшчае шмат солі, паколькі соллю яе кансервуюць. Такім чынам, ікру трэба з асцярожнасцю ўжываць людзям, схільным да ацёкаў, або пры павышаным артэрыяльным ціску.

### Нізкакаларыйны маянэз — суцэльныя дабаўкі?

Класічны маянэз — гэта жаўток, воцат, соль, цукар, гарчыца і алей. Паколькі асноўная частка маянэзу — алей, то каларыйнасць гэтага любімага ўсімі соуса досыць высокая. Адсюль пайшлі ўсякія «нізкакаларыйныя» маянэзы, якія ў многіх выпадках вельмі мала нагадваюць сабой менавіта маянэз. Бо для таго, каб знізіць каларыйнасць, неабходна нечым замяніць алей, — напрыклад, крухмалам, загушчальнікамі, стабілізатарамі. Хоць каларыйнасць усё роўна застаецца высокай. Таму лепш за ўсё самому прыгатаваць востранькі соус. Для гэтага змяшайце натуральны абястлушчаны ёгурт з лімонным сокам і рознымі спецыямі.

### Ці ёсць карысць у марынаваных аліўках і маслінах?

Аліўкі і масліны — плады аліўкавага дрэва. Наогул толькі мы, «былыя савецкія», называем чорныя плады — маслінамі, а зялёныя — аліўкамі. Аліўкі маюць высокую харчовую каштоўнасць з-за вялікай колькасці карыснага алею — да 60 працэнтаў у асобных гатунках. Тлушч гэты карысны ненасычанымі тлустымі кіслотамі, якія «змагаюцца» з «дрэнным» халестэрынам. З чорных алівак атрымліваюць алей, а зялёныя кансервуюць. Пры гэтым яны могуць як заставацца зялёнымі, так і набываць чорны колер. Добрай якасцю алівак з'яўляецца тое, што яны не губляюць свае вартасці падчас кансервацыі. Ужываюць кансерваваныя аліўкі як у салатах, так і ў якасці закускі, для абуджэння апетыту.

### Ці не страчвае замарожанае мяса бялок?

Найбольш высокую харчовую каштоўнасць мае ахаладжанае мяса. Але мы ўсё часцей выкарыстоўваем мяса замарожанае. Таму што любім «атаварыцца» на ўвесь тыдзень, а не бегаць у магазін штодня.

Для таго ж, каб падчас размарозкі прадукты не страчвалі сваіх спажыўных вартасцяў, іх трэба правільна размарожваць. Напрыклад, мяса лепш за ўсё дастаць з маразільнай камеры і як мінімум на 12 гадзін размясціць на паліцы ў халадзільніку. Так мяса будзе адтайваць больш павольна і менш страціць карысных рэчываў. Калі ж спрабаваць размарозіць мяса хутка, то яго клеткі будуць пашкоджвацца крышталікамі лёду, утворыцца шмат «мяснога соку», разам з якім страціцца і бялок, і іншыя патрэбныя рэчывы.

**P.S.** *Цікавую інфармацыю пра здаровае харчаванне можна атрымаць на сайце* kapitonova.info ■

■ Планаванне сям'і

# ДА ЗАЧАЦЦЯ ТРЭБА ПРЫЦЯГВАЦЬ... СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

**ПРАКТЫЧНА ў кожным горадзе ў буйных жаночых кансультацыях працуюць кабінеты планавання сям'і. З аднаго боку, іх задача — ажыццяўляць падрыхтоўку да цяжарнасці, а з другога — папярэджваць непажаданую цяжарнасць.**

**Маці траіх дзяцей, аўтар праекта «Кормім грудзямі» Наталля РАЗАХАЦКАЯ** лічыць, што самае галоўнае права чалавека — гэта права выбару, і планаванне сям'і дапамагае ў ажыццяўленні аднаго з самых важных і лёсавызначальных выбараў: «Мы з мужам планавалі ўсіх сваіх дзяцей. Калі размова заходзіць пра вялікую сям'ю, трэба зразумець, як і што ты будзеш паспяваць. Гэтае разуменне ў далейшым дапамагае сумяшчаць мацярынства і актыўную дзейнасць».

Паводле слоў **галоўнага спецыяліста па акушэрстве і гінекалогіі Міністэрства аховы здароўя Беларусі Святланы САРОКІ,** вынік работы падобных кабінетаў — зніжэнне колькасці абортаў у 5 разоў за апошнія дзесяць гадоў. У 2000-м, напрыклад, на кожныя роды прыпадала 2 аборты. Што да нараджальнасці, то калі ў 2007 годзе ў краіне нарадзілася крыху больш за 97 тысяч дзяцей, то летась — крыху больш за 108 тысяч. Разам з тым колькасць абортаў зніжаецца не столькі на карысць нараджэнняў, колькі дзякуючы цывілізаванаму планаванню колькаснага складу сваёй сям'і.

**Вось ужо на працягу года ў нашай краіне выконваецца медыкаментозны аборт. Гэта нетраўматычны спосаб з досыць рэдкімі пабочнымі эфектамі. Прымяняецца толькі да 49-га дня з апошняга дня менструацыі.**

**Ала КАМЛЮК, загадчыца аддзялення планавання сям'і і дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій РНПЦ «Маці і дзіця»**, кажа: «У сярэднім на наш кабінет планавання сям'і прыпадае каля 3 тысяч наведванняў за год. 47 працэнтаў наведванняў звязана з жаданнем спланаваць сваю цяжарнасць, каля 30 працэнтаў — з падборам сродку кантрацэпцыі. Астатнія прыходзяць з канкрэтнай праблемай і просьбай яе вырашыць. Гэта, як правіла, такія гінекалагічныя паталогіі, як невыношванне або адсутнасць цяжарнасці. З праблемай зачацця сёння сутыкаецца прыкладна кожная чацвёртая беларуская пара. Безумоўна, галоўным чынам, да нас звяртаюцца менавіта пары».

Сёння кожная пара, якая мае на мэце нараджэнне дзіцяці, павінна загадзя наведаць не проста ўролага і гінеколага па месцы жыхарства (гэта, як вядома, трэба пры любым раскладзе рабіць хоць бы раз на год), але звярнуцца па кансультацыю менавіта ў кабінет планавання сям'і. Рэпрадуктыўнае здароўе нацыі значна пагоршылася. У папуляцыі вырасла колькасць цяжарнасцяў, якія перастаюць развівацца. У мужчын істотна знізілася колькасць здаровых і актыўных сперматазоідаў у семявай вадкасці. Акрамя таго, досыць распаўсюджаныя сярод абодвух палоў інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам. Дастаткова сказаць, што «бяскрыўдны» на першы погляд урэаплазмоз уплывае на рухавасць сперматазоідаў.

У тым, што ты цалкам здаровы, трэба пастаянна сумнявацца, кажуць медыкі. Ёсць, скажам, жанчыны, якія абсалютна перакананыя ў тым, што вядуць здаровы лад жыцця — не здраджваюць абранаму вегетарыянству нават падчас цяжарнасці. І шчыра здзіўляюцца, калі цяжарнасць перастае развівацца... У сучасных умовах мужчына і жанчына абавязкова павінны абследавацца згодна з тымі рэкамендацыямі, якія дасць спецыяліст кабінета планавання сям'і.

**У другім квартале наступнага года ў цэнтры «Маці і дзіця» адкрыюцца новыя магчымасці аказання дапамогі парам, у якіх адзін з партнёраў інфіцыяваны ВІЧ, гепатытамі В і С. Абсталяванне спецыяльнай лабараторыі дазваляе ажыццявіць працэдуру так званага адмывання спермы. Такім чынам, пары атрымаюць магчымасць зачаць здаровае дзіця некантактным чынам. Паслуга будзе платнай, але дастаткова даступнай па кошце** ■

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.**

■ Гісторыя і лёсы

# «Платон Крэнь — інтэлігент з народа»

## Так Васіль Быкаў назваў пісьменніка Платона Крэня, майго прадзеда, у прадмове да яго кнігі «Бывай, Ярашоўка»

**Які складаны лёс у роднай зямлі — такі складаны лёс і ў чалавека. Ніколі не ведаеш, якім шляхам пойдзеш па жыцці. У Платона Крэня іх было некалькі: па адным крочыў сам, іншыя — выбіралі за яго.**



Платон Крэнь.

ПАЭТ, мемуарыст, публіцыст, ён пачынаў сваю творчасць як сатырык у віленскай «Маланцы» пад псеўданімамі Прохар Калавец, Шыпшына, Бім-Бом, Бух-Бом. Пісаў фельетоны, за якія пасля паплаціўся. З-пад яго пяра выйшла нямала вершаў: пра радзіму, пра асабістыя пакуты... Магчыма, сёння творчасць Платона Крэня вывучалі б у школе, томікі яго вершаў стаялі б у бібліятэцы, а яго імя — побач з класікамі беларускай літаратуры...

Толькі ў XX стагоддзі такія перспектывы чакалі нямногіх. У Платона Крэня іх не было, відаць, нават на гарызонце. Як шолахаўскага Рыгора Мелехава, лёс ганяў пісьменніка то да бальшавікоў, то да Белай гвардыі. Пазней ён напіша: «Я не белы, не чырвоны, а проста чалавек, які заблытаўся ў павуцінні».

Ён ніколі не здраджваў самому сябе: у эміграцыі імкнуўся на радзіму, пасля ўз'яднання Усходняй і Заходняй Беларусі не баяўся ў мясцовых газетах друкаваць патрыятычныя вершы. Толькі аднойчы, каб выжыць і пракарміць сям'ю, збочыў з правільнага шляху. За гэта быў асуджаны на 8 гадоў зняволення. Пасля вызвалення пачаў занатоўваць успаміны, выйшаўшы на магістральную тэму сваёй творчасці — ГУЛАГ.

Яго дачка, Ірына Крэнь, прыклала шмат намаганняў, каб вярнуць добрае імя бацькі. Пасля яго смерці яна сабрала ўсю літаратурную спадчыну пісьменніка, якая захавалася, і выдала кнігу «Бывай, Ярашоўка».

«Я не спадзявалася, што калі-небудзь раскажу пра лёс свайго бацькі і яго творчасць, — піша Ірына Платонаўна ў прадмове да кнігі. — Здавалася, што нябыт паглынуў яго імя назаўсёды. Як і тысячы іншых талентаў, «невядомых, непрызнаных, не аплаканых нікім», што браліся за пяро, пэндзаль, скрыпку ў неспрыяльных умовах...»

Не думала і я, што давядзецца напісаць пра лёс свайго прадзеда...

Платон Крэнь нарадзіўся ў 1896 годзе ў сям'і гаспадароў фальварка Ярашоўка, недалёка ад Моўчадзі, што ў Баранавіцкім раёне Брэсцкай вобласці. Хараство роднага краю ён не аднойчы апяваў у вершах:

*Зноў аглядаю прасторы, узгоркі,*
*Роднае сэрцу, мілае ўсё!*
*Дзень мой шчаслівы, хлеб мой нягоркі.*
*Дзякую, Край мой, за сонца тваё!*

...І ўспамінаў напрыканцы жыцця: «Калыска майго дзяцінства, юнацтва і роднае гняздо сталых гадоў... Прыгажосць і багацце пахаваны ў віхурах пажараў і войнаў, векавы сасновы бор, што некалі ўпрыгожваў зямлю, знішчаны драпежнікамі, духмяныя, у кветках, сенажаці — здзічэлі. Ад цудоўных старасвецкіх садочкаў сядзібы засталіся паўмёртвая груша і яблыня, след бацькоўскага жылля зарос муравой. У начную навальніцу яшчэ шумяць чатыры бярэзіны, старая елка і вербы ля балота — гэта стогн былой Ярашоўкі, апошнія слёзы ў апошняй песні...»

Сям'я Платона Крэня была патрыярхальнай. Хлопец нарадзіўся дзясятым у бацькоў. Андрэй Крэнь быў пісьменным чалавекам. Строгі і абачлівы, ён выхоўваў дзяцей у духу прыстойнасці і сумленнасці. У доме панаваў культ кнігі: доўгімі зімнімі вечарамі школьнік Платон для ўсёй сям'і ўголас чытаў Сянкевіча, Гогаля, Пушкіна...

Вучыўся Платон Крэнь у Келецкай мужчынскай гарадской гімназіі. У 1913 годзе скончыў і настаўніцкую гімназію ў Клецку. Датэрмінова, у жніўні 1915 года, яго прызвалі на вайсковую службу.

У 1916 годзе Платон Крэнь скончыў школу прапаршчыкаў у Пецяргофе, атрымаўшы званне афіцэра. Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі 1917 года засталі маладога вайскоўца ў Фінляндыі, у 423-м пяхотным палку. У снежні 1917 года камандзірам палка быў абраны Вацлаў Юшкевіч. Паміж землякамі адразу завязалася сяброўства (Юшкевіч быў са Слоніма). Той і ўгаварыў Платона Крэня паехаць на Дон, дзе ішлі баі.

Мы пайшлі на кватэру да палкоўніка Карнілава. У гасцёўні з праціснутай мяккай мэбляй і парванымі шпалерамі сядзелі некалькі мужчын і адна жанчына. Мы таксама прымасціліся на край канапы. Хуткім крокам увайшоў палкоўнік Карнілаў, малады чалавек гадоў пад трыццаць, элегантна апрануты, у форме, з гладкім англійскім праборам у цёмных валасах... Усе мы імгненна былі залічаны ў атрад».

ТАК Платон Крэнь апынуўся ў шэрагах Белай гвардыі. Праўда, хутка атрад Карнілава быў разбіты бальшавікамі. Выратавацца ўдалося нямногім. Сярод «шчасліўчыкаў» быў і мой прадзед. Разам з уцалелымі вайскоўцамі ён адступіў у Крым, дзе пад камандаваннем генералаў Дзянікіна і Урангеля ўдзельнічаў у баях.

*...Беларус стаяў вякамі*
*На развілцы тых пуцін,*
*Сілай скуты кайданамі,*
*Спаняверaны, адзін.*

«Калі генерал Урангель, які камандаваў Каўказскай арміяй на царыцынскім напрамку, спрабаваў выратаваць становішча і падпарадкаваць казакоў дзянікінскаму камандаванню, генерал Рамашэўскі прыклаў шмат сіл, каб пасварыць Дзянікіна з Урангелем. Напачатку арлоўскай катастрофы Урангель павінен быў пакінуць Царыцынскі фронт і адступаць. Сварка з Дзянікіным паскорыла развязку. Ён зусім пакінуў камандаванне».

Грамадзянская вайна заканчвалася. Белыя вымушаны былі ўцякаць. Многія былі эвакуяваны ў Турцыю, у тым ліку і мой прадзед. Тут ужо не было ні дысцыпліны, ні камандзіраў. Хацелася толькі аднаго — хутчэй вярнуцца дамоў. Малады афіцэр прыклаў шмат намаганняў, каб атрымаць пашпарт для выезду на радзіму. Замест гэтага — высылка ў ваенны лагер Белай гвардыі.

«Ужо другі месяц як я лічуся ваякам у Аляксееўскім палку, па чарзе хаджу па хлеб у гарадское інтэнданцтва, сплю ў зялёнай палатцы на зямлі — у шынялі і пад шынялём, лаўлю чарапах, каб у бляшанцы зварыць суп, і атрымліваю сутачны паёк ад саюзнікаў: чацвярцінку хлеба, сталовую лыжку фасолі або сушанай гародніны, лыжку мясных кансерваў і драбок солі. Днём і ўначы адчуваю невыносны, д'ябальскі голад».

**Як шолахаўскага Рыгора Мелехава, лёс ганяў пісьменніка то да бальшавікоў, то да Белай гвардыі.**

Сілу надавалі вершы, жывілі, бы кропля вады ў пустыні:

*... Светлых песень было мала,*
*Іх стварыць народ не мог,*
*Бо няволя закавала*
*Бег разложыстых дарог.*

ХУТКА наступілі перамены. У лагеры аб'явілі, што замежныя падданыя могуць пераходзіць на становішча бежанцаў. Платон Крэнь прад'явіў сваё літоўскае пасведчанне і быў вызвалены.

І зноў вяртанне ў Канстанцінопаль. Заставалася знайсці грошы на дарогу дахаты, але пра гэта даводзілася толькі марыць. Так і прадаваў бы пончыкі, калі б не сустрэў на вуліцах горада свайго пляменніка, сябра дзяцінства. Іван Фурса працаваў тут у ювелірнай краме. Высветлілася, што ён таксама прайшоў цяжкім шляхам Белай гвардыі. У Івана была іншая бяда: польскае консульства адмовіла яму ў пашпарце. Платон Крэнь дапамог атрымаць свайму земляку «пропуск» дахаты, пацвердзіўшы ў консульстве, што яны сваякі. Фурса аддзякаваў яму грашыма. Разам сябры адправіліся на радзіму. Гэта было ў жніўні 1921 года.

У міжваенны час Платон Крэнь у Ярашоўцы ладзіць вечарыны і спектаклі, піша вершы для віленскіх выданняў. Праўда, не ўсе творы публікаваліся. Часопіс «Маланка» ў раздзеле «Наша пошта» нават звяртаўся да аўтара: «З вашых вершаў падыходзіць толькі «Цуд на Крэсах», а на рэшту і артыкулаў у Кодэксе карным не хопіць. На пісьмо Ваша дадзім адказ па пошце».

*... Глянуў я, а ў Антона*
*Ужо хата бела!*
*На калу сядзіць варона,*
*З дзіва аж самлела...*
*Хай Эўропа тое знае,*
*Што не даў ён маху:*
*«Цуд» знадворку ўжо ззяе*
*Ад зямлі — да даху...*

*(Урывак з верша «Цуд на Крэсах»)*

Абяцанага ліста з Вільні доўга чакаць не давялося. Рэдактар часопіса Янка Маланка дзякаваў за вершы, даваў ім высокую ацэнку, толькі папярэджваў: «Пішыце не так востра, не па канфіскату».

І ён пісаў. Праўда, гэты занятак быў недаспадобы яго жонцы. Пелагея Пятроўна, хоць і скончыла гімназію, але не ўхваляла, што муж замест таго, каб працаваць у полі ці дапамагаць па гаспадарцы, складае вершы. У моманты злосці яна кідала рукапісы ў печ, пры гэтым кажучы, што толькі дурні пішуць вершы.

А Платон Крэнь не мог жыць, каб не пісаць. Праз шмат гадоў у лісце да сваёй дачкі Ірыны ён прызнаецца: «Што да вершаў, то я іх ненавіджу, яны ў мяне на адзін манер. Бо я ныцік, абломак старога часу... Не хачу цябе засмучаць — табе патрэбна іншае: бадзёры ветрык, без ценю дзень, водар без паху гнілі. А гэта дзе мне ўзяць? Я хацеў, я спрабаваў умясціць у сабе ўсё гэта, але не магу, — мне трэба нарадзіцца на свет зноў. І што яшчэ горш — пісаць не магу кінуць. Калі прыходзіць настрой — плачу, але пішу, і стамляюся, быццам дровы сек, але затое на душы становіцца ціха, у мозгу — пуста, нічога не мучыць».

Пасля ўз'яднання Усходняй і Заходняй Беларусі і ўсталявання Саветаў Платон Крэнь уліўся ў вір новага жыцця. Слухаў па радыё навіны, чытаў Леніна і Сталіна, не прапускаў вясковыя сходы, дасылаў у мясцовыя выданні патрыятычныя вершы. Паралельна працаваў настаўнікам у вясковай школе. Праўда, хутка быў звольнены з запісам: «Кулак і белагвардзеец». Людзям такой «катэгорыі» не было месца нідзе: як і многіх, сям'ю Крэняў павінны былі выселіць з Ярашоўкі.

Не паспелі: пачалася Вялікая Айчынная...

ПІСЬМЕННІК дапамагаў жонцы, якая стала партызанскай сувязной. У лес перапраўлялі лекі, ратавалі савецкіх акружэнцаў: кармілі, пераапраналі, забяспечвалі прытулкам... Пазней Платон Крэнь прызнаецца: «Горад быў наводнены шпікамі і эсдоўцамі. І таму, каб не згубіць сям'ю і сябе, я пачаў друкаваць фельетоны ў мясцовай газеце — аб спекуляцыі, аб самагоншчыках, ...аб паляках-«поні», якія грэбавалі ўсім беларускім...»

А ў хаце, застаўшыся сам-насам, пісьменнік пісаў тое, што церабіла яго душу, не давала спакою:

*У агонь і ваду,*
*І на мукі, што ждуць,*
*За Радзіму пайду,*
*Як мяне пазавуць.*
*Не кажу, што слабы,*
*Не кажу, што стары, —*
*Я яшчэ малады,*
*Каб хавацца ў нары!..*

*(Баранавічы, 1943 год)*

Аднойчы пра такія вершы даведаўся адзін са сваякоў Платона Крэня і напісаў данос на фельетаніста. Прадзеда арыштавалі немцы. У лепшым выпадку ён павінен быў трапіць у лагер смерці, у горшым — на шыбеніцу. На шчасце, знайшоўся чалавек, які выратаваў земляка.

Толькі праз шмат гадоў Платону Крэню стала вядома прычына арышту: «Вясной 1943 года, — пісаў ён у заяве да Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Леаніда Брэжнева, — на мяне быў данос стрыечнага брата маёй жонкі, аб чым я даведаўся праз многа гадоў, — данос у нямецкую жандармерыю і следчы аддзел аб тым, што ў 1940 годзе я быў бальшавіком, пісаў у абласную газету «Чырвоная звязда», што я і жонка мая лечым раненых партызан, што я знаходжуся ў Баранавічах і назіраю за рухам нямецкіх войскаў і самалётаў, каб перадаваць гэтыя звесткі партызанам...»

Пасля вайны Пелагея Крэнь атрымала дакументы, якія пацвярджалі яе ўдзел у партызанскім руху. Яе муж такіх даведак не атрымаў... Замест гэтага — лагер, адкуль вярнуўся праз 8 гадоў, хворы на сухоты і асуджаны на забыццё.

«Напачатку пасадзілі ва ўнутраную турму МУС у Баранавічах, — успамінаў Платон Крэнь, — абвінавачваючы ў хаўрусніцтве з немцамі і ў агітацыі (мае фельетоны і вершы)... Тады я зразумеў, што я таксама палітык, і не малы. Днём і ноччу следчы пачаў трэсці мяне, як грушу, выбіваючы прызнанне «віны»... Каля трох месяцаў я сядзеў у гэтай турме, а суда ўсё не было. Нарэшце, мяне выклікалі ў кабінет да начальніка і аб'явілі, што справа мая накіроўваецца ў Маскву, у так званую Асобую нараду. Ці то суд не судзіў мяне з-за адсутнасці сведак, ці то следчыя органы палічылі за лепшае накіраваць справу ў Маскву, дзе завочна прымалася рашэнне, але праз два дні мяне выслалі этапам туды, куды Макар і цялят не ганяе».

Пакаранне Платон Крэнь адбываў ва Унжлагу МУС Горкаўскай вобласці.

«З лагерным жыццём я пазнаёміўся, уцягнуўся ў работу, але стамляўся ўсё больш, пачаў знясільвацца. Галодная, без тлушчаў ежа, пакутлівы адпачынак уначы на голых нарах, душэўныя пакуты адбіралі сілы...».

*... Як пра гэта мне сказаць у словах?*
*Восем горкіх вёснаў — у аковах.*
*Восем сумных вёснаў — у няволі.*
*Восем вёснаў смутку, стратаў, болю...*

Гэты жах скончыўся ў лютым 1953 года, калі Платон Крэнь вярнуўся ў Ярашоўку. Ён быў цяжка хворым і адзінокім: маці і жонка памерлі, дзеці раз'ехаліся. Адзінае, што не давала зламацца, — творчасць. Ён імкнуўся хутчэй расказаць пра ГУЛАГ. Напрыканцы жыцця набраўся тоўсты сшытак «лагерных» твораў, які пасля незваротна знік.

Прадзед неаднойчы імкнуўся дабіцца рэабілітацыі... Усё было дарэмна. Відаць, так было наканавана лёсам. У Васіля Быкава сваё тлумачэнне: «...Платон Крэнь трапіў якраз у такі д'ябальскі млын, які няспынна малоў сваіх і чужых, ворагаў і прыяцеляў. Мабыць, то была найгоршая сітуацыя — апынуцца паміж дзвюх сіл, абедзве з якіх былі варожыя і чужыя... Апынуўшыся між імі воляю лёсу, а не з уласнага выбару, малады афіцэр каціўся ў той бок, куды гнала сіла мацнейшая...»

Неяк Платон Крэнь папрасіў сваю дачку запісаць шчырую споведзь пра драматычныя падзеі свайго жыцця, хацеў назваць імёны антыфашыстаў з асяроддзя акупацыйных улад, з якімі супрацоўнічаў на карысць партызанаў. Ірына тады не мела часу, думала, што потым запіша. Не паспела... 23 верасня 1962 года Платон Крэнь памёр.

Ірына Платонаўна не магла сабе дараваць, што адмахнулася ад бацькавай просьбы. Быццам просячы прабачэння, яна сабрала ўцалелыя творы пісьменніка і выдала кнігу. Бацькавы радкі мелі вялікае значэнне для яе, пачынаючай журналісткі і пісьменніцы, якая шмат гадоў пасля працавала ў выдавецтве «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» і ў рэдакцыі газеты «Наша слова» .



**За сямейным сталом. Злева направа: Платон Крэнь, нявестка Марыя з мужам Уладзімірам, сярэднім сынам пісьменніка, нявестка Антаніна з дзецьмі.**

«Тваё пытанне, як пісаць, каб стаць найбольш карысным людзям, — пытанне складанае, вялікае. Галоўнае — трэба пісаць праўду. Са словам трэба абыходзіцца вельмі асцярожна, так асцярожна, што лепш нічога не пісаць, чым пісаць пра тое, што не пад сілу. Слова павінна азараць і запальваць, як агонь, без гэтага няма паэта, няма жыцця».

**Вераніка КАНЮТА**

■ Факт

### ГЛЫБОКАЕ — ВІШНЁВАЯ СТАЛІЦА БЕЛАРУСІ

**Нядаўна ў Мінску адбыўся фінал рэспубліканскага конкурсу творчых работ па прасоўванні гарадоў і рэгіёнаў Беларусі ў рамках III Міжнароднага форуму «Імідж Рэспублікі Беларусь: час дзейнічаць».**

Аддзел фізічнай культуры, спорту і турызму Глыбоцкага райвыканкама паспяхова прадставіў праект «Вішнёвы фэст», які заняў другое месца. Гэты праект дасць магчымасць прыцягнуць увагу да рэгіёна, стварыць новы турыстычны брэнд. У якасці ўзнагароды распрацоўкай гэтага брэнда зоймецца прызёр Міжнароднага фестывалю рэкламы «Канскія львы» агенцтва «Крынь». Праводзіцца вішнёвы фэст і ў курортным горадзе Лаўран на ўсходзе Харватыі. Лаўран славіцца сваімі вішнямі, сакрэт смаку якіх спрабуюць раскрыць стагоддзямі. Таксама Вішнёвы фестываль праводзіцца ў Турцыі, у расійскіх гарадках.

Задумана, што і ў Глыбоцкім раёне турысты змогуць паспытаць цудоўныя вішнёвыя пірагі, джэмы, марозіва і нават віно.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### КАМУНАЛЬШЧЫКАМ — НОВАЕ АБСТАЛЯВАННЕ

**Учора ў горадзе Масты адбылася ўрачыстая перадача раённай ЖКГ абсталявання па зборы камунальных адходаў.**

Мастоўскія камунальшчыкі атрымалі ў карыстанне больш за 150 еўракантэйнераў для паасобнага збору пластыку, паперы і шкла, больш за 900 кантэйнераў для арганічных (біяраскладальных) адходаў (харчовых адходаў, раслінных рэшткаў і інш.), смеццявозы для іх абслугоўвання і бульдозер для забеспячэння эколагабяспечнай утылізацыі адходаў на палігоне на агульную суму больш за 500 тысяч долараў. Цырымонія афіцыйнай перадачы абсталявання і дэманстрацыя яго работы адбылася на станцыі сартавання адходаў у Мастах.

Акрамя паасобнага збору адходаў у ходзе рэалізацыі праекта мяркуецца ўкараніць новую практыку хатняга кампаставання ў межах прыватнай забудовы райцэнтра і Мастоўскага раёна. Атрыманы кампост будзе прымяняцца на прысядзібных участках жыхарамі дамоў.

**Леанід ТУГАРЫН.**

■ Экслібрыс «Звязды»

# ДЭТЭКТЫЎНАЕ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

*Запрудскі Ігар. «Па дарозе на Парнас: атрыбуцыйныя даследаванні і пытанні рэцэпцыі беларускай літаратуры XIX ст.»*

*Зборнік навуковых артыкулаў. Выдавецтва БДУ, 2012.*




Гэтую кнігу, разлічаную ў першую чаргу на зацікаўленых XIX стагоддзем чытачоў, трэба хаваць ад тых, чыё знаёмства, хай сабе трывалае, з беларускай літаратурай абмежавалася школьнай праграмай. А што калі не схаваць? Ведаю з уласнага досведу, што тады пасля заняткаў падыдуць студэнты, якія ў школе былі выдатнікамі, і пачнуць высвятляць, чаму іх вучылі няправільна.

Чаму верш «Зайграй, зайграй, хлопча малы...» у школьных падручніках прыпісваюць Паўлюку Багрыму, калі яго, аказваецца, напісаў іншы аўтар? Чаму паэма «Тарас на Парнасе», напісаная, па апошніх меркаваннях, нібыта Ялегіем Пранцішам Вулем (што, праўда?) у хрэстаматыях друкуецца пад імем Канстанціна Вераніцына?

Адказы на падобнага кшталту пытанні, хай нават адаптаваныя да ўзросту студэнтаў і сітуацыі, шмат дадаюць да разумення літаратурнага працэсу. Таму што напісаць верш «Зайграй, зайграй, хлопча малы...» у 1828 годзе — значыць, апярэдзіць свой час, а напісаць гэты верш у сярэдзіне 1850-х гг. — гэта ўсяго толькі быць сынам свайго часу, зрэшты, варта цаніць гэтую шыкоўную містыфікацыю, зладжаную не са злачыннымі, а з высакароднымі мэтамі.

Насамрэч ёсць некалькі версій пра аўтарства гэтага твора, але артыкул чарговы раз даказвае, што Паўлюк Багрым да верша дакладна не меў ніякага дачынення. «...увесну тагачасны ўладальнік маёнтка Крашын Пётр Святаполк-Завадскі быў вінен П. Багрыму немалую па тым часе суму — 700 рублёў. Павел Іосіфавіч у час паўстання не жыў у бядоце, не гараваў. З перадшлюбнага «экзамену» (існавала ў XIX ст. такая сур'ёзная працэдура) вядома, што ў 1864 г. ён вырашыў стварыць уласную сям'ю. Абранніцай 52-гадовага мешчаніна стала маладая асоба, 26-гадовая шляхцянка і ўдава Карнелія Шышлоўская».

Разгортваючы гэты літаратуразнаўчы дэтэктыў, І. Запрудскі заадно згадаў еўрапейскую гісторыю літаратурнага містыфікавання і беларускі ўнёсак у яе — і артыкул ператварыўся ў захапляльную чытанку. Там ёсць акцэнтаванне таго, што самым вядомым беларускімі містыфікатарам з'яўляецца Францішак Багушэвіч (мы прывыклі лічыць псеўданімамі імёны Мацей Бурачок і Сымон Рэўка з-пад Барысава, але пры жыцці пісьменніка пра яго аўтарства ведала вельмі мала людзей, усё стала вядомым толькі пасля ягонай смерці). І. Запрудскі нязмушана ўвёў у тэкст нават экстравагантныя моманты кшталту пакінутай Адамам Міцкевічам пікантнай беларускамоўнай фразы.

Таксама ў кнізе закранаюцца пытанні атрыбуцыі (вызначэння аўтарства, часу і месца напісання) многіх тэкстаў беларускай літаратуры XIX ст., згадваецца біяграфія і творчасць Я.П. Вуля, В. Каратынскага, А. Кіркора, В. Савіча-Заблоцкага, Ф. Багушэвіча. Два артыкулы («Кастусь Каліноўскі: абрысы і штудыі душы і лёсу» і «Зшальмаваны Кастусь Каліноўскі: тэхналогіі астракізму») прысвечаны асобе Кастуся Каліноўскага, погляды на значэнне якога ў беларускай гісторыі і культуры развіваюцца па сінусоідзе: І. Запрудскі эмацыйна і аргументавана адгукаецца на несумленнае паднаўленне некаторымі гісторыкамі меркаванняў 1928 года.

У беларускай літаратуры XIX ст. цікавыя не толькі тэксты, але і пазалітаратурныя фактары: тыя ўмовы і асяродкі, у якіх тэксты былі створаны, аўтарская матывацыя да напісання твора, мэтавая аўдыторыя як яе разумеў аўтар.

Напрыклад, відавочна, што В. Дунін-Марцінкевіч выразна бачыў складаны шлях твора ад аўтара-шляхціца да непісьменнага селяніна: «Свае беларускія творы пісьменнік пісаў з разлікам на абавязковага пасрэдніка (вылучана І. Запрудскім) пры камунікацыі. Ім мусілі выступаць дабрачынныя паны і паненкі, якія, сабраўшы сялян, чыталі б творы на іх мове. Значыць, творчасць Беларускага Дудара мела двайнога адрасата і павінна была рэалізоўвацца ў форме аўтар — чытач — слухач».

Тыя першыя творы пісаліся з разлікам на вузкі жыццёвы досвед слухачоў. Відавочна, у новых сітуацыях чытання, калі адпала неабходнасць у пасрэдніку, калі пашырыўся кругагляд, гэтыя тэксты ўспрымаюцца інакш. Калі сёння нейкія тэксты беларускай літаратуры XIX ст. здаюцца занадта простымі, трэба памятаць, што гэта сведчыць не пра інтэлектуальны і адукацыйны ўзровень іх аўтараў-шляхціцаў, а пра ўзровень сялянскай мэтавай аўдыторыі.

Кніга бачыцца каштоўнай не толькі думкамі і фактамі, але і аўтарскай інтанацыяй — страснай (наколькі гэта магчыма ў межах навуковага стылю) і натуральнай (усе гістарычныя асобы паўстаюць са старонак кнігі без лішняга пафасу, з вартасцямі і недахопамі).

Плён навуковай дзейнасці І. Запрудскага адлюстраваны таксама ў ранейшым выданні — «Нарысы гісторыі беларускай літаратуры XIX ст.» (2003). Абедзве кнігі даследчыка несумненна важныя для навукоўцаў, але складана вызначыцца, ці рэкамендаваць іх настаўнікам і выкладчыкам. Калі пакінуць па-за ўвагай фактар цэнтральнага тэсціравання, застануцца іншыя ваганні: напрыклад, расказваць пра Паўлюка Багрыма так, як пра яго напісана ў падручніках, ці ўсё-ткі праўду? Сама я схлусіць сваім студэнтам не змагла.

**Аксана БЯЗЛЕПКІНА**

■ Будзь у курсе!

### І ПАСАЖЫРАЎ ЗАДАВОЛІЦЬ, І СРОДКІ НЕ МАРНАВАЦЬ

Вызначаны графік працы камунальнага пасажырскага транспарту ў сталіцы на перыяд правядзення калядных і навагодніх свят. Ён складзены як з мэтай забеспячэння перавозак, так і рацыянальнага выкарыстання бюджэтных сродкаў. Так, па інфармацыі дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс», праца пасажырскага транспарту будзе арганізавана: на гарадскіх аўтобусных маршрутах 23-25, 30-31 снежня, 1-2, 6-7 студзеня — па графіку нядзельных дзён; на тралейбусных і трамвайных маршрутах 23-24, 30-31 снежня і 6 студзеня — па графіку суботніх дзён, а 25 снежня, 1-2 студзеня, 7 студзеня — па графіку нядзельных.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ПАДАТКІ ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

У апошнім квартале наступнага года ў беларускіх плацельшчыкаў з'явіцца магчымасць аплачваць падаткі праз інтэрнэт, паведамляе прэс-служба МПЗ. Больш за тое, зараз спецыялісты гэтай галіны разглядаюць магчымасць стварэння спецыяльнага цэнтра інфармавання падаткаплацельшчыкаў. У гэтым выпадку ўсе жыхары Беларусі, якія падключаны да сістэмы электроннага дэкларавання, змогуць у рэжыме рэальнага часу атрымліваць поўную інфармацыю аб аплаце сваіх падаткаў, магчымых запазычанасцях і сумах налічанай пені.

**Сяргей ПАЛІНІН**

■ На слыху

### ВОДАЗАБЕСПЯЧЭННЕ АДНОЎЛЕНА

Дзве гадзіны жыхары Жыткавіч, а гэта каля 15 тысяч чалавек, заставаліся без водазабеспячэння. Падстанцыя ля вёскі Кольна, якая забяспечвае электраэнергіяй мясцовы водазабор, аварыйна адключылася ў 21.26. Як паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, без электрычнасці адначасова заставаліся тры населеныя пункты гэтага раёна: Буйнавічы, Чырвоная Зорка і Кажановічы. Сіламі мясцовага РЭСа і камунальнікаў у 23.30 энергазабеспячэнне было адноўлена, пасля чаго зноў запрацаваў і водазабор. Па папярэдняй інфармацыі, прычынай здарэння сталі ўмовы надвор'я — адбылося адключэнне паветраных ліній. Зараз падача вады цалкам адноўлена.

### МЕДЫКІ-ВЫРАТАВАЛЬНІКІ

Калі днём па службовых лініях паступіла паведамленне, што загарэўся дом у вёсцы Бібікі Мазырскага раёна, яго пачулі не толькі выратавальнікі, але і фельчары хуткай дапамогі, якія знаходзіліся непадалёк па выкліку. Да прыбыцця выратавальнікаў медыцынскія работнікі разам з суседам з задымленых пакояў вывелі гаспадара дома і яго двухгадовага ўнука, якім не спатрэбілася шпіталізацыя. Агонь знішчыў дах будынка і частку маёмасці. Па звестках прэс-службы Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, узгаранне выклікана перапалам печы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**



Яўгена Пясецкага. Фота слова

*Прадчуваю снягі. Чую: блізяцца белыя хмары,*
*Шарахцяць аб настылыя дахі далёкіх ускраін.*
*Дзень і Ноч варагуюць, як у Біблііі Авель і Каін,*
*Не хаваюцца людзі за сонечныя акуляры.*

*Я не з гэтых часоў — я адтуль, дзе вяснуе Няміга,*
*Дзе Вяснянка, Малінаўка, Грушаўка*
*ў сонечных кветках!*
*Але ўсё прамінае, і не варта спрачацца пра гэта,*
*Як засведчыла тая, аўтарытэтная кніга.*

*Я гартаю старонкі. Засынае у кубачку кава.*
*Церушыць за вакном той жа дождж,*
*як да эры Хрыстовай.*
*Калі ўсё прадказалі, ці не варта пачаць ўсё нанова?*
*Можа, так. Але гэта ўжо іншая справа.*

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения по генплану № 11 в границах пр. Дзержинского, пр. Любимова, ул. Семашко. Жилой дом № 11 по генплану. 1-я очередь строительства»

**Застройщик**: Общество с ограниченной ответственностью «Фармоэкспотех», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 22 ноября 2007 г. № 2720 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 101472333.

Юридический адрес: Республика Беларусь, 220090, г. Минск, ул. Кольцова, дом 19, ком. 15.

Почтовый адрес: Республики Беларусь, 220020, г. Минск, пр-т Победителей, д. 89, кор. 2, пом. 10, каб. 18, 41. ***Тел. 8 (017) 216 00 09, 8 (029) 654 10 10, 8 (029) 708 46 64.***

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

В течение трех предшествующих лет ООО «Фармоэкспотех» строительство не осуществляло.

**Информация о проекте строительства.**

**Цель строительства –** исполнение условий договора № 413Д от 10 октября 2011 года, заключенного с Минским городским исполнительным комитетом на реализацию права проектирования и строительства многоквартирного жилого дома со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения по генплану № 11 в границах пр. Дзержинского, пр. Любимова, ул. Семашко.

Строительство осуществляется с выделением очередей:

1-я очередь строительства – жилой дом №11 по генплану со встроенно-пристроенными помещениями с выделением пусковых комплексов:

- 1-й пусковой комплекс – жилая часть, секции №№ 1, 2, 3, внутриквартальные инженерные сети и сооружения, автостоянка, благоустройство и озеленение;

- 2-й пусковой комплекс – жилая часть секции №№ 4, 5, 6, инженерные сети и сооружения, автостоянка, благоустройство и озеленение;

- 3-й пусковой комплекс – встроенно-пристроенные помещения общественного назначения с сопутствующими работами по благоустройству и озеленению;

2-я очередь строительства – подземный гараж-стоянка с сопутствующими работами по благоустройству и озеленению.

Начало строительства 1 очереди – ноябрь 2012 года, окончание строительства 1 очереди – декабрь 2014 года.

Застройщиком получены:

- заключение государственной экспертизы (РУП «Главгосстройэкспертиза») архитектурного проекта с рекомендацией к утверждению проекта № 710-15/11 от 26.09.2011 г. с дополнениями, изложенными в экспертном заключении № 310-15/12 от 30.05.2012 г.;

- решение Минского городского исполнительного комитета № 1647 от 31 мая 2012 года «Об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства и внесении изменения в решение Мингорисполкома»;

- свидетельство (удостоверение) № 500/654-3239 о государственной регистрации на право временного пользования на земельный участок с кадастровым номером 500000000005006195, расположенный по адресу: г. Минск, в границах пр. Дзержинского, пр. Любимова, ул. Семашко, площадью 0,6168 га для строительства и обслуживания объекта «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения по генплану № 11 в границах пр. Дзержинского, пр. Любимова, ул. Семашко»;

- свидетельство (удостоверение) № 500/654-3240 о государственной регистрации на право временного пользования на земельный участок с кадастровым номером 500000000005006196, расположенный по адресу: г. Минск, в границах пр. Дзержинского, пр. Любимова, ул. Семашко, площадью 1,6916 га для строительства и обслуживания объекта «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения по генплану № 11 в границах пр. Дзержинского, пр. Любимова, ул. Семашко»;

- разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-203Ж-023/12 от 20.11.2012 г.

Генеральный подрядчик ООО «ДомСтройАгент». Договор строительного подряда №-26-07-2012/С от 26.07.2012 г.

Первая очередь строительства – шестисекционный 414-квартирный жилой дом с переменной этажностью (14-21 этажей) запроектирован в границах пр. Дзержинского, пр. Любимова, ул. Семашко. Генеральный план застройки решен компактно с учетом выгодного градостроительного положения, функционального зонирования территории, существующих и проектируемых транспортных и инженерных коммуникаций, зоны влияния строящейся линии метрополитена, рельефа местности, а также обеспечения противопожарных норм и правил. Дом в плане имеет форму пологой дуги. Под всем домом в первом и во втором этажах размещаются помещения общественного назначения. В здании имеются помещения технического подполья и теплый технический чердак. Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас с наружными стенами из блоков ячеистого бетона. Наружная отделка фасадов – штукатурка модифицированным полиминеральным фактурным составом с последующей покраской фасадной фактурной модифицированной силиконом краской. Оконные блоки–стеклопакеты ПВХ, лоджии и балконы остеклены. Планировки квартир выполнены с учетом принципов функционального зонирования, внутренняя отделка квартир – подготовка под финишную отделку. В каждой секции предусмотрен мусоропровод. Здание оборудовано необходимыми инженерными системами, необходимыми для функционирования жилого дома. Предусмотрено выполнение мероприятий по организации безбарьерной среды для физически ослабленных лиц и маломобильных групп населения.

**В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в общую долевую собственность**, входят:

помещения инженерного назначения (электрощитовые, машинные отделения, мусоросборники, тепловые пункты, лифтовые шахты, водомерный узел); коридоры (за исключением коридоров, составляющих вспомогательные площади по отношению к встроенным, встроенно-пристроенным помещениям), лифты и лифтовые холлы, вестибюли, межэтажные лестницы и переходные балконы, тамбуры, конструкции дома, водоотводящие устройства, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства, гостевые парковки, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Вся территория благоустраивается и озеленятся за счет организации подъездов, проездов и автостоянок, формирования сети пешеходных тротуаров, дорожек и аллей, площадок, устройства подпорных стенок и наружных лестниц, создания декоративно-ландшафтных композиций, расстановки малых архитектурных форм. Благоустройство внутридворовой территории включает устройство детских площадок, площадок для отдыха взрослого населения, для занятия спортом.

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц однокомнатные, двухкомнатные, трехкомнатные, четырехкомнатные и пятикомнатные квартиры:**

При 100% оплате стоимости квартиры в течение 5 календарных дней с даты подписания договора долевого строительства стоимость **1 м² 990 долларов США.**

При оплате в рассрочку стоимость **1 м² 1100 долларов США**. Стоимость неизменна до окончания строительства. Оплата за объект долевого строительства производится дольщиком поэтапно в соответствии с графиком платежей. По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка.

**Ознакомление дольщиков с планировками квартир**, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется в рабочее время ООО «Фармоэкспотех» по адресу: г. Минск, проспект Победителей, д. 89, кор. 2, помещение 10, каб. 1. Уполномоченный представитель по вопросам долевого строительства ОДО «Айрон», действует на основании договора об оказании инженерных услуг от 20.08.2010 №-120/У. ***Тел. 8 (017) 216 00 09, 8 (029)654 10 10, 8 (029) 708 46 64. Официальный сайт www.airon.by.***

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА, НАХОДЯЩЕГОСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ

**Аукцион состоится 17 января 2013 г. в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.**

**Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел.: 8(0222) 229022, 311185, 223375.**

**Продавец предмета торгов – Могилевское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация», тел. 8(0222)220837.**

Аукцион проводится в соответствии с Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже некоторых объектов республиканской собственности, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 30 марта 2009 г. № 36.

Заявления на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104, начиная со дня публикации извещения. Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **15 января 2013 г. с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00.** Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

Заключительная регистрация участников аукциона **17 января 2013 г. с 10.00 до 10.50.**

**Сведения о предмете торгов**

| Наименование и краткая характеристика | Место нахождения | Краткая характеристика объекта | Начальная цена предмета торгов, тыс. руб. | Сумма задатка, тыс. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Изолированное помещение 453,5 кв.м | Могилевская обл., г.Чериков, ул. Болдина, д. 27-4 | Изолированное помещение расположено в двухэтажном кирпичном здании; перекрытия – железобетонные плиты, крыша рулонная | 1 085 046,508 | 108 000,0 |

Задаток перечисляется на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Аукцион является открытым, его участниками могут быть граждане Республики Беларусь, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы (иностранные государства и их административно-территориальные единицы в лице уполномоченных органов, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные организации, не являющиеся юридическими лицами, созданные в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь и лица без гражданства, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь).

Для участия в аукционе в указанный в настоящем извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрацию юридического лица и его подлинник для заверения его копии организатором аукциона;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором торгов;

